СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	IV квартал
63850 (індывідуальны)	12400	37200
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800
63858 (ведамасны)	19900	59700
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — *на 12 гадзін раней*

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 ЖНІЎНЯ 2010 г. ПЯТНІЦА № 167 (26775)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«Ніякага канфлікту паміж Беларуссю і Расіяй няма, акрамя рознагалоссяў палітыкаў»

Такую думку выказаў учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з губернатарам Курскай вобласці Расіі Аляксандрам Міхайлавым, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Абсалютна ніякага канфлікту паміж Беларуссю і Расіяй няма, ніякага канфлікту паміж расіянамі і беларусамі няма і быць не можа. Усё, што адбываецца, гэта абсалютна суб'ектыўна. Гэта асобасны канфлікт, таму вы так яго і ўспрымайце», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што не збіраецца рэагаваць на выпады ў расійскіх СМІ адносна яго асабіста і краіны. «Мяне ўсё больш падштурхоўваюць да таго, каб я неяк рэагаваў на тое, што сёння адбываецца ў сродках масавай інфармацыі адносна мяне і Беларусі. Я не збіраюся гэтага рабіць», — сказаў беларускі лідар. Ён таксама дадаў, што ўся тая гразь, якая вылілася ў Расіі, «датычыцца не Беларусі і беларускага Прэзідэнта, гэта фільм пра іх». «Яны хочуць, каб і ўсе такія былі. Таму ніякай рэакцыі на гразь мы з Беларусі не дапусцім, колькі б там ні ствараліся гэтых фільмаў», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка зноў падкрэсліў, што «няма такой сілы і такіх палітыкаў, якія маглі б разарваць нашу дружбу, наша братэрства. «Вы павінны ведаць: хочуць палітыкі ці не хочуць, беларусаў і расіян разарваць нельга», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што гаворыць гэта не таму, што, як многія лічаць, «Беларусі і Лукашэнку няма куды дзявацца». «Свет вялікі, варта толькі варухнуцца ў патрэбным напрамку, — сказаў Прэзідэнт. — Беларусь адна не была і не застанецца. Толькі не ведаю, ці выгадна гэта будзе кіраўніцтву Расіі. Тое, што нашым народам будзе нявыгадна, — гэта факт».

Звяртаючыся да губернатара Курскай вобласці, Аляксандр Лукашэнка прапанаваў «пакінуць усю гразь за дужкамі» і падкрэсліў, што ў Беларусі яны знойдуць надзейных партнёраў, гатовых аказаць любую дапамогу. «Ніякай арыентацыі ўлева або ўправа ў нас няма. Мы абсалютна надзейныя і вытрыманыя партнёры», — сказаў ён.

Беларусь гатова спакойна і па-дзелавому пераходзіць на новыя ўмовы работы з Расіяй, але хоча, каб яны былі справядлівыя і не такія дыскрымінацыйныя, як у выпадку з пошлінамі на нафтапрадукты.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што неабходна вызначыць дакладныя і зразумелыя правілы работы ў рамках Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана без якіх-небудзь выключэнняў. «Тым больш, што тыя выключэнні, якія існуюць, і пошліны абсалютна ніякай выгады, акрамя шкоды, нашым адносінам з Расійскай Федэрацыяй не даюць», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што па-ранейшаму тармозіцца рэалізацыя дасягнутых у Маскве і Астане дамоўленасцяў, аднак не па віне беларускага боку.

СТАР. 2

Блізкая ўлада

НА САМЫМ ПРАБЛЕМНЫМ ПРАДПРЫЕМСТВЕ

У рамках трэцяга этапа маніторынгу работы органаў мясцовай улады ўпаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта па Брэсцкай вобласці старшыня праўлення Нацбанка Беларусі Пётр ПРАКАПОВІЧ правёў прыём грамадзян на самым праблемным прадпрыемстве Брэста — дывановым камбінаце.

На ААТ «Дываны Брэста» сёння самая нізкая зарплата сярод прамысловых прадпрыемстваў абласнога цэнтра. У свой час кіраўніцтва камбіната не прыняло адпаведных захадаў для мадэрнізацыі вытворчасці. Як вынік, камбінат працуе з вялікімі стратамі. За апошнія гады на падтрымку брэсцкіх дываноўшчыкаў было выдзелена 50 мільярдаў рублёў з бюджэту, але і гэта не прывяло да кардынальных пераменаў. Толькі дзяржава не мае намеру пакідаць вялікі калектыў сам-насам з эканамічнымі праблемамі. І хутка будуць прыняты рашучыя меры для аздараўлення вытворчасці. Гэта гучала не раз падчас сустрэчы з работнікамі камбіната, а таксама на невялікай прэс-канферэнцыі па выніках прыёму.

Месца правядзення сустрэчы паўплывала на яе змест. Лічаныя адзінкі прыйшлі скардзіцца на работу чыноўнікаў, прыхапіўшы папкі са сваёй перапіскай. У большасці сваёй людзі ішлі проста з набалелым, з надзённымі праблемамі. У некаторых вельмі маленькая зарплата, а дома — дзеці, груз штомесячных выплат па крэдытах за жыллё. Ім і адказвалі ў адпаведнасці са становішчам прадпрыемства і яго перспектывамі. А ткачыхі Святлана Кітаеўская, Валянціна Кот, Ларыса Грыцук, якія маюць стаж работы каля чвэрці веку кожная, палічылі, што маюць права ўзняць праблему адносінаў да рабочага чалавека. Пакой для прыёму ежы не абсталяваны як след, гарачай вады няма, а вытворчасць, як вядома, пыльная, зімой у цэху холадна, у начныя змены працуюць ткачы, а абслугоўваючы персанал не працуе. Калі ж гэтыя пытанні ставіш перад непасрэдным начальствам, то можна пачуць у адказ, што вас, маўляў, ніхто не трымае. «Хіба ж можна так з людзьмі, якія працуюць тут болей за 20 гадоў? — задае рытарычнае пытанне адна з жанчын. — Мы разумеем праблемы, разумеем, што добра там, дзе нас няма. Але ж хацелася б, каб добра было і ў нас». З пастаноўкай пытання па паляпшэнні ўмоў працы цалкам пагадзіўся мэр горада Аляксандр Палышанкоў, які вёў прыём разам з Пятром Пракаповічам. Так што, ёсць спадзяванні, што ў бліжэйшы час у цэхах камбіната з'явяцца пакоі для прыёму ежы з мікрахвалёўкай і чайнікам, а таксама душ.

СТАР. 4

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» с 1 октября 2010 года устанавливает процентную ставку в размере 7 процентов годовых по ранее принятым срочным банковским вкладам (депозитам) физических лиц в иностранной валюте:

- срочный вклад в иностранной валюте на 380 дней;
- срочный банковский вклад «Универсальный» в долларах США и евро;
- срочный банковский вклад в иностранной валюте «Капитал» (18 месяцев);
- срочный банковский вклад в иностранной валюте на 40 месяцев.

По срочным банковским вкладам в иностранной валюте «Капитал» (18 месяцев) и срочным банковским вкладам в иностранной валюте на 40 месяцев указанный размер процентов будет применяться по истечении 6 месяцев со дня заключения договора.

Проценты, выплаченные по различным видам вкладов, депозитов в течение 2009 г., млн. бел. руб.

январь	февраль	март	апрель	май	июнь	июль	август	сентябрь	октябрь	ноябрь	декабрь	2009 год
65380,5	84821,5	99934,1	97189,8	74575,8	104240,6	87728,7	89863,7	93977,5	82045,6	103608,1	183630,6	1166996,5

Информация о процентах, выплаченным по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам размещена на информационных стендах в подразделениях банка и на сайте

www.belarusbank.by

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ЧЫТАЧЫ «ЗВЯЗДЫ» ПРАПАНУЮЦЬ МІНІСТРУ КУЛЬТУРЫ ЗНЯЦЬ ФІЛЬМЫ ПРА ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ І ВЫБІТНЫХ БЕЛАРУСАЎ

А некаторыя — пра сябе ці сваю родную мясціну

У нумары ад 17 ліпеня мы перадалі заклік міністра культуры Паўла Латушкі: шаноўныя чытачы, падказвайце ідэі для дакументальных фільмаў! На што, а на ідэі нашы людзі багатыя. Бяры — ды здымай толькі!..

Вера Віктараўна КРАЧКО з пасёлка Магілеўцы Пружанскага раёна 52 гады адпрацавала ў школе. Піша, што добра было б зняць дакументальныя фільмы пра Вялікіх князёў Літоўскіх — а то імёны мы ведаем, а адрозніць аднаго ад другога можам не заўсёды... Таксама Вера Віктараўна просіць дакументалістаў разабрацца нарэшце ў асобе Мураўёва-вешальніка: ці быў ён напраўду такім вялікім злачынцам, ці нагаворваюць? Пералічвае Вера Віктараўна і нашых сучаснікаў, пра якіх было б цікава даведацца больш: Міхаіла Фінберга, Янку Сіпакова, Міхаіла Савіцкага... Агульная заўвага чытачкі — мала праграм на тэлебачанні скіравана на моладзь. І старэйшае пакаленне не можа даведацца, чым займаецца сённяшняя моладзь, якія мае захапленні і таленты... Замест гэтага, скардзіцца Вера Віктараўна, можна пабачыць «ток-шоу кшталту «Жыву з метрасэксуалам»...

Чытачка Ганна КАЗЛОВА з вёскі Лаўніца Барысаўскага раёна кіруе народным фальклорным калектывам «Лаўнічанка». Ганна Мікалаеўна падказвае ідэю: «На АНТ ішоў цудоўны праект «Песні маёй краіны». Якія цудоўныя калектывы выступалі, вось які таленавіты наш народ! Думаю, што адтуль можна ўзяць шмат што для здымак».

СТАР. 4

Каментар міністра

«Чытачы «Звязды» маюць разуменне, пра што павінна здымацца нацыянальнае дакументальнае кіно ў Беларусі»

Усе вашы прапановы, шаноўныя чытачы, мы перадалі асабіста міністру культуры Беларусі Паўлу ЛАТУШКУ. Павел Паўлавіч азнаёміўся з усімі ліставі і пракаментаваў «Звяздзе»:

Мне асабліва спадабаліся прапановы наконт серыі фільмаў пра Вялікіх князёў Літоўскіх, зацікавіла ідэя фільма пра еўрапейскую архітэктуру ў Беларусі — бо ад канца XVI стагоддзя наша шляхта запрашала сюды выбітных еўрапейскіх архітэктараў...

— Па-першае, я хацеў бы вельмі падзякаваць газеце «Звязда» і чытачам за тую актыўнасць, якую яны праявілі, дасылаючы свае прапановы, ідэі для рэалізацыі дакументальных фільмаў нашымі кінавытворчымі прадпрыемствамі. Хацеў бы адзначыць, што прапановы досыць разнастайныя — гэта сведчанне, што ініцыятары прапаноў маюць даволі шырокі падыход і разуменне таго, пра што павінна здымацца нацыянальнае дакументальнае кіно ў Беларусі. Мне спадабалася, што шмат тэмаў краналі гісторыю нашай краіны, нашу культурную спадчыну, якая пацвярджае глыбінныя сувязі з агульнаеўрапейскай культурнай прасторай. Вельмі важна таксама, што чытачы газеты прапанавалі здымаць фільмы па сучасных тэмах.

Мне асабліва спадабаліся прапановы наконт серыі фільмаў пра Вялікіх князёў Літоўскіх, зацікавіла ідэя фільма пра еўрапейскую архітэктуру ў Беларусі — бо ад канца XVI стагоддзя наша шляхта запрашала сюды выбітных еўрапейскіх архітэктараў... Я думаю, з таго, што прапанавана, будзем мець вялікую магчымасць выбару праектаў для наступнай рэалізацыі. Вялікі дзякуй!

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.08.2010 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	3 012,00	1 чэшская крона	153,92
1 еўра	3 833,07	1 польскі злоты	960,67
1 латвійскі лат	5 408,03	1 расійскі рубель	97,72
1 літоўскі літ	1 109,70	1 украінская грыўня	381,76

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,8227
10 UAH	39,0640
1000 BYR	10,2299
EUR	39,1911

Агенцтва Уладзіміра Грайцова

Дзяржаўны інтарэс

Леанід Сасноўскі: «ТРЫБАФАТЫКА — ГЭТА ІНАВАЦЫІ Ў НАВУЦЫ, АДУКАЦЫІ, ТЭХНАЛОГІЯХ»

ПРЫХІЛЬНІКІ

— Леанід Адамавіч, вядома, што новая навука ўзнікае ці ствараецца не так ужо часта. А калі дакладней, дык, можа, раз у 50-100 год. Дарэчы, пра гэта гаварыў яшчэ ў 1995 годзе былы міністр адукацыі і навукі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Васіль Іванавіч Стражаў, падкрэсліваючы, што Рэспубліка Беларусь з'яўляецца калыскай трыбафатыкі, і гэта робіць ёй гонар, што прызналі буйныя вучоныя нашага часу. Дык вось пытанне: што такое трыбафатыка і як яна ствараліся і ўмацоўвала свае пазіцыі?

— Слова «трыбафатыка» складаецца з дзвюх частак: «трыба» — трэнне, знос і «фатык» — стомленасць. У гэтым слове нібы спалучаюцца дзве ўказаныя з'явы, якія ўзаемадзейнічаюць паміж сабой у метале, механічных сістэмах машын у час іх эксплуатацыі (работы) і паступова разбураюць іх. Інакш кажучы, узнікаюць комплексныя зносастомленасныя пашкоджанні, заканамернасці якіх і вывучае трыбафатыка.

— А што, раней гэта не назіралася, не выяўлялася, не было прадметам даследаванняў?

— Як жа, было ўсё пералічанае. Толькі разлік тых пашкоджанняў, тых разбурэнняў вёўся на стомленасць і знос асобна, як фактараў, якія дзейнічаюць самі па сабе. А група энтузіястаў трыбафатыкі даказала, што знос, трэнне, стомленасць «працуюць у адной звязцы», у комплексе, і гэта ўжо не фактары, а з'ява.

— А што гэта азначае?

— А тое, што ў механіку пашкоджання і разбурэння, дадаткова да традыцыйнага аналізу фактараў, прыйшла новая метадалогія — феноменааналіз.

— Ці нельга патлумачыць гэта больш зразумела для чытачоў?

— Можна, вось вобраз: эфект натоўпу. Калі асобна пражывае сто чалавек і кожны робіць сваю справу — гэта нармальна; яны, скажам так, не небяспечныя. Але калі гэтыя людзі сабраліся ў адзіны натоўп і моцна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой для дасягнення нейкай мэты — гэта ўжо грозная сіла, здольная зрабіць нямала бедаў... Вось мы ў трыбафатыцы і стварылі тэорыю лямбда-ўзаемадзейнічанняў пашкоджанняў, калі яны «працуюць» не асобна, а разам.

— І што гэта дае?

Калі мы пазналі з'яву, у нас адкрываецца практычная магчымасць кіраваць ёй.

— Мы, Леанід Адамавіч, першым сустрэцца з вамі, пазнаёмімся з выказваннямі аб трыбафатыцы самых аўтарытэтных вучоных.

Віцэ-прэзідэнт Расійскай акадэміі навук, акадэмік РАН і Акадэміі навук Беларусі Канстанцін Васільевіч Фралоў, прафесар, доктар тэхнічных навук, Герой Сацыялістычнай Працы, дырэктар Інстытута машыназнаўства імя Благанравава РАН сказаў яшчэ ў 1993 годзе: «Менавіта ў Беларусі нарадзілася і паспяхова развіваецца новая навука — трыбафатыка». Мы ведаем, што вы называеце Канстанціна Васільевіча хросным бацькам трыбафатыкі. Чаму?

— А таму, што ён быў першым слынным механікам нашага часу, які вывучыў асноўныя палажэнні трыбафатыкі, належным чынам ацаніў іх і зрабіў незвычайны крок. У 1993 годзе ён асабіста прыехаў да нас у Гомель, дзе адкрываўся першы Міжнародны сімпозіум па трыбафатыцы, і публічна выказаў пра яе сваё аўтарытэтнае меркаванне. А на спецыяльнай прэс-канферэнцыі, якую мы з ім праводзілі сумесна, Канстанцін Васільевіч паўтарыў сваю ацэнку. Ці трэба гаварыць, што гэта адкрыла нам шлях да прызнання?

— А вось думка акадэміка НАН Украіны, прафесара, доктара тэхнічных навук, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і Украіны, дырэктара Інстытута праблем трываласці НАН Украіны (1995) Валерыя Трафімавіча Трошчанкі: «Новая навука трыбафатыка... дазволіць правільна канструяваць адказныя вузлы машын і збудаванняў». Дык дазволіла ці не?

— Вядома ж, дазволіла. Група вядомых механікаў у складзе М.С. Высоцкага, К.В. Фралова, В.Т. Трошчанкі і М.А. Махутава распрацавала новыя прынцыпы праектавання трыбафатычных сістэм. Вынік — павышэнне дакладнасці прагназавання іхняй эксплуатацыйнай даўгавечнасці.

— Не менш цікавае і выказванне члена-карэспандэнта РАН, прафесара, доктара тэхнічных навук, загадчыка аддзела трываласці, рэсурсу і бяспекі Інстытута машынабудавання імя Благанравава РАН Мікалая Андрэевіча Махутава (1993), які цяпер з'яўляецца старшынёй рабочай групы пры Прэзідыуме РАН па аналізе рызыкі і праблемах бяспекі, старшынёй Міждзяржаўнага навукова-тэхнічнага Савета краін СНД па надзвычайных сітуацыях: «Трыбафатыка як навука, як відаць, зойме сваё месца ў адным з новых напрамкаў, якім займаецца сёння і Расійская акадэмія навук, і акадэміі навук іншых дзяржаў. Гэты напрамак уключае: тэорыю, фізіку, хімію, механіку катастроф, бяспеку і метады абароны... ад тэхнагенных аварый і катастроф». Хачу спытаць, ці атрымалася?

— Атрымалася. На VI Міжнародным сімпозіуме па трыбафатыцы, які адкрываецца сёлета 25 кастрычніка ў Мінску, будзе спецыяльны пленарны даклад М.А. Махутава па праблемах тэхнагеннай бяспекі Расіі, дзе будзе адзначана і роля нашых работ у праблеме ацэнкі рызык і небяспекі. А ў Беларусі зацверджаны Дзяржаўны стандарт, які рэгламентуе працэдуры іх прагнознай ацэнкі.

Не можам не прывесці тут і словы такога аўтарытэта ў навуцы, як Герой Беларусі, акадэмік НАН Беларусі, прафесар, доктар тэхнічных навук, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута машынабудавання НАН Беларусі Міхаіла Сцяпанавіча Высоцкага. Вось што ён напісаў для высокааўтарытэтнага акадэмічнага часопіса «Наука и инновации»: «У 2001-2010 гг. па Дзяржаўнай навуковай праграме «Механіка» выкананы шэраг заданняў па трыбафатыцы (навуковыя кіраўнікі — доктар тэхнічных навук Леанід Сасноўскі, доктар фізіка-матэматычных навук Міхаіл Жураўкоў, кандыдат тэхнічных навук Валерый Жмайлік і інш.). Аналіз навуковага ўзроўню праведзеных работ прыводзіць да заключэння, што ў гэтым новым і перспектыўным раздзеле механікі канкрэтна рэалізуецца сфармуляваны мной дэвіз: перагнаць, не даганяючы. Пра гэта доказна гаварылася ў загаловачным дакладзе на 3-м Беларускім кангрэсе па тэарэтычнай і прыкладной механіцы. На самай справе, мы нікога не даганялі ў галіне трыбалогіі — проста была створана фактычна паралельная трыбалогія, якая стала адным з раздзелаў трыбафатыкі. Яе сутнасць у тым, што ўказаны новы і эфектыўны шлях (і метады) мэтавага кіравання зносастомленаснымі пашкоджаннямі за кошт узбуджэння пазакантактных цыклічных нагрузак. Гэта так званы зваротны эфект у трыбафатыцы. Мы нікога не даганялі і ў галіне механічнай стомленасці — проста было паказана, што трэнне і зношванне — не фактары, якія ўплываюць на характарыстыкі стомленаснага разбурэння, але з'явы, якія складаным чынам (дыялектычна) узаемадзейнічаюць са з'явай стомленасці. Гэта так званы прамы эфект у трыбафатыцы: устаноўлена, што працэсы трэння і зношвання, у залежнасці ад умоў іх рэалізацыі, могуць не толькі знікаць, але і істотна павышаць супраціўленне стомленасці. Тым самым мы «абышлі» і трыбалогію, і механіку стомленаснага разбурэння, стварыўшы на іх стыку трыбафатыку. І аказалася, што наперадзе нас нікога няма. Гэта пацвярджаецца дакладамі беларускіх спецыялістаў па трыбафатыцы на буйнейшых міжнародных форумах, напрыклад, у ЗША, Аўстраліі, Японіі, Германіі і іншых краінах.

— Леанід Адамавіч, а якая роля акадэміка Міхаіла Сцяпанавіча Высоцкага ў станаўленні і развіцці трыбафатыкі?

ЗНАЁМІМ З СУРАЗМОЎЦАМ

Атрымалася так (а можа гэта наканавана лёсам), што сёлетні год для Леаніда Адамавіча «наскрозь» юбілейны: па-першае, яму стукнула 75. З жонкай у каханні і згодзе пражыў 50. Споўнілася паўстагоддзя яго навукова-вытворчай і педагагічнай дзейнасці. Апошнія 30 гадоў працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту. Але як для вучонага для яго, мяркуем, асабліві юбілей: споўнілася роўна 25 гадоў новай навуцы — трыбафатыцы, заснавальнікам якой яго лічаць па праве.

Леанід Адамавіч — ураджэнец вёскі Палессе Чачэрскага раёна. Сярэднюю школу закончыў з сярэбраным медалём у вёсцы Шылавічы, пасля чаго была паспяховая вучоба і атрыманне дыплома інжынера-механіка ў Ленінградскім ордэна Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга горным інстытуце імя Пляханава. Працяглы час працаваў на заводах, у навукова-даследчых інстытутах і вышэйшых навучальных установах Расійскай Федэрацыі, Украіны і Беларусі. Сёння — прафесар БелДУТа, дырэктар таварыства з абмежаванай адказнасцю «НВА «ТРЫБАФАТЫКА», навуковы кіраўнік Міжведамаснай лабараторыі «ТРЫБАФАТЫКА», пратакол аб стварэнні якой быў падпісаны прэзідэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, старшынёй Камітэта па навуцы і тэхналогіях РБ, міністрамі адукацыі і прамысловасці рэспублікі. Лабараторыя створана для вырашэння міждысцыплінарных праблем у сферах навука—вытворчасць—адукацыя.

Прафесар Леанід Сасноўскі — буйны вучоны. Ён — доктар тэхнічных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Украіны, Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, член Расійскага Нацыянальнага Камітэта па тэарэтычнай і прыкладной механіцы, сустаршыня Міжнароднага каардынацыйнага савета па трыбафатыцы, які быў створаны ў 1996 годзе Акадэміямі навук Расіі, Беларусі і Украіны. Ён — спецыяліст у галіне механікі матэрыялаў і канструкцый, сістэм, якія рухаюць і дэфармуюць, аўтар больш як 700 навуковых работ і вынаходніцтваў. З'яўляецца Ганаровым грамадзянінам горада Чачэрска.

Першы Міжнародны сімпозіум па трыбафатыцы (Гомель, 1993). Старшыня Навукова-праграмнага камітэта Канстанцін ФРАЛОЎ (злева), старшыня Міжнароднага камітэта Мікалай МАХУТАЎ (справа, абодва Масква) і старшыня Арганізацыйнага камітэта Леанід САСНОЎСКІ (Гомель).

ISSN 1990 - 763X

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«Ніякага канфлікту паміж Беларуссю і Расіяй няма, акрамя рознагалоссяў палітыкаў»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт таксама выказаў сумненне ў неабходнасці прагматызацыі адносінаў Беларусі і Расіі. «Хто яго ведае, ці патрэбны нам гэты падыход у нашых адносінах паміж двума гістарычна і духоўна блізкімі дзяржавамі і народамі, — сказаў Прэзідэнт. — Не ўсё, вядома, можна змераць рублём, доларам або, калі хочаце, кубаметрамі газу. Але калі так стала прынята ў некага ў Маскве — мы вымушаны гэта ўлічваць і са свайго боку».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць супрацоўніцтва з рэгіёнамі фундаментам беларуска-расійскай інтэграцыі. Кіраўнік беларускай дзяржавы са шкадаваннем канстатаваў, што сусветны фінансава-эканамічны крызіс негатыўна адбіўся як на двухбаковых адносінах, так і на гандлёвым супрацоўніцтве. У мінулым годзе ўзаемны тавараабарот скараціўся на трэць, а з асобнымі рэгіёнамі — напалову. Аднак дзякуючы цесным сувязям з расійскімі рэгіёнамі, у тым ліку з Курскай вобласцю, у гэтым годзе пачынаецца выхад на дакрызісны ўзровень гандлю. На думку Прэзідэнта, гэты працэс можна значна паскорыць, устараніўшы штучныя бар'еры. Кіраўнік дзяржавы лічыць важным забяспечваць роўныя ўмовы для работы беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў. «Неабходна аператыўна і эфектыўна вырашаць усе ўзнікаючыя праблемныя пытанні, не дапускаючы разрыву напрацаваных гадамі кааперацыйных, гандлёвых і партнёрскіх сувязяў. Гэта залог забеспячэння росту дабрабыту жыхароў нашых краін і рэгіёнаў», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Курская вобласць — традыцыйны гандлёва-эканамічны партнёр Беларусі. Ужо трэці раз губернатар гэтай вобласці наведвае нашу краіну. На думку беларускага лідара, гэта збліжэнне — аб'ектыўны працэс, не падвержаны скарацечнай палітычнай кан'юнктуры. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што для Беларусі вельмі важны эканамічны аспект узаемадзеяння з цэнтральнай федэральнай акругай Расіі.

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што Беларусь і Курскую вобласць аб'ядноўваюць даўнія партнёрскія адносіны і ўзаемныя інтарэсы ва ўсіх сферах супрацоўніцтва. «Аднак час простых таварных адносінаў — гэта добра, але трэба пераходзіць на якасна новы ўзровень адносінаў, — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы. — Нам трэба рэалізоўваць сумесныя ўзаемавыгадныя праекты, якія забяспечваюць інавацыйны шлях развіцця эканомік дзвюх краін і канкурэнтаздольнасць агульнай прадукцыі на сусветным рынку». Так, на думку Прэзідэнта, прыярытэтным праектам у рамках супрацоўніцтва, здольным падцягнуць за сабой і іншыя сферы, можа стаць зборачная вытворчасць тралейбусаў ААТ «Белкамунмаш» на базе ААТ «Курскэлектратранс».

Аляксандр Лукашэнка заклікаў губернатара Курскай вобласці да адкрытага абмеркавання актуальных пытанняў двухбаковага ўзаемадзеяння, «нягледзячы ні на якія праблемы, што, на жаль, палітыкі высокага ўзроўню спрабуюць стварыць ва ўзаемаадносінах Расіі і Беларусі».

БЕЛАРУСЬ — ГАНАРОВЫ ГОСЦЬ МАСКОЎСКАЙ МІЖНАРОДНАЙ КНІЖНАЙ ВЫСТАВЫ-КІРМАШУ

З 1 па 6 верасня ў Маскве пройдзе 23-я міжнародная кніжная выстава-кірмаш. Беларусь едзе туды ўпершыню як ганаровы госць. Раней такі статус атрымлівалі Польшча, Францыя, Кітай, Украіна і Індыя. Міністэрства інфармацыі стварыла аргкамітэт, у складзе якога прадстаўнікі нашага пасольства ў Расіі, Міністэрства адукацыі, Міністэрства культуры, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Саюза пісьменнікаў Беларусі, Нацыянальнай бібліятэкі і іншых арганізацый.

Учора аргкамітэт абмеркаваў планы ўдзелу Беларусі ў міжнародным кніжным форуме, які, дарэчы, бярэ пачатак яшчэ з 1977 года. Абмеркаванне было эмацыйным. Тое і зразумела: неабходна прадставіць нашу краіну як мага лепш. «Беларусь заўсёды ў цэнтры ўвагі на такіх мерапрыемствах. Тым болей што цяпер мы — ганаровыя госці», — нагадала прысутным **Лілія АНАНІЧ, першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі**. Таксама яна нагадала, што беларускім вопытам удзелу ў падобных выставах цікавяцца замежныя калегі.

Экспазіцыя Беларусі разгорнецца на плошчы ў 320 квадратных метраў. Болей за 40 вядучых выдавецтваў, паліграфічных прадпрыемстваў будуць прадстаўляць лепшыя ўзоры сваёй прадукцыі. Акрамя таго на выставе адбудуцца шматлікія сустрэчы з пісьменнікамі і мастакамі (напрыклад, са старшынёй Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалаем Чаргінцом), прэзентацыі беларускіх кніг і акцыі з удзелам наведвальнікаў форуму. У першы дзень кірмашу да Беларусі будзе асаблівая ўвага. Наша Рэспубліка стане галоўнай дзейнай асобай на ўрачыстым адкрыцці міжнароднай выставы, падчас якога Беларусь падаруе свае лепшыя выданні Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы. Пасля адбудзецца прэзентацыя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Будуць там выстаўлены і выдавецкія праекты Саюзнай дзяржавы, выданні, прысвечаныя Чарнобыльскай трагедыі, 600-годдзю Белавежскай пушчы.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Віцэ-прэм'ер Іван БАМБІЗА:

«МАГУТНАСЦІ ПЕРАПРАЦОЎЧАЙ ГАЛІНЫ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ТОЛЬКІ НАПАЛОВУ»

Ва ўрадзе незадаволеныя работай айчынных кансервавых прадпрыемстваў

У перапрацоўчай галіны нашай прамысловасці ёсць сур'ёзныя недахопы. І вінаватыя ў гэтым не толькі кіраўніцтва прадпрыемстваў, але і ўлады на месцах, якія дрэнна арганізоўваюць працу па забеспячэнні гэтых прадпрыемстваў сыравінай. Ёсць нараканні і на арганізацыі, якія займаюцца закупам сыравіны ў насельніцтва. Пра гэта ўчора заявіў намеснік кіраўніка ўрада краіны Іван Бамбіза.

Ён падкрэсліў, што ва ўрада ёсць прэтэнзіі да перапрацоўчых прадпрыемстваў:

— У краіне апошнім часам рэалізавана шмат дзяржаўных праграм па развіцці перапрацоўкі. Зроблена сур'ёзная мадэрнізацыя нашых кансервавых прадпрыемстваў. Іх вытворчыя магутнасці павялічаныя ўдвая — яны могуць вырабляць 700 мільёнаў умоўных слоікаў. Але павінен канстатаваць, што сёння гэтыя магутнасці дрэнна выкарыстоўваюцца — на 40-50 працэнтаў, — заявіў намеснік старшыні ўрада.

Гэтыя факты выклікаюць пастаянную крытыку з боку ўрада ў адрас мясцовых уладаў і кіраўніцтва прадпрыемстваў, заўважыў Іван Бамбіза.

— Павінен быць створаны канвеер па забеспячэнні прадпрыемстваў сыравінай. У нас ёсць вытворчыя магутнасці, якія дазваляюць нам вырабляць якасныя кансервы. Але мы сутыкаемся з тым, што насельніцтва скардзіцца на адсутнасць айчынных кансерваў. А сельгаспрадпрыемствы, якія вырошчваюць садавіна-гароднінную і ягадную прадукцыю, не могуць яе рэалізаваць, — канстатаваў віцэ-прэм'ер.

Адзінае, з чым, паводле слоў Івана Бамбізы, нашай перапрацоўчай галіне ўдаецца нядрэнна спраўляцца — вытворчасць сокаў. На нашым рынку прадстаўлены сёння ўвесь асартымент сокавай прадукцыі. Прычым, што немалаважна, айчынныя прадпрыемствы кіруюцца не тэхнічнымі ўмовамі, а ДАСТамі, дзе больш жорсткія патрабаванні да якасці.

Паводле слоў Івана Бамбізы, у адрас кіраўнікоў райвыканкамаў і кіраўнікоў кансервавых прадпрыемстваў былі накіраваныя тэлеграмы з патрабаваннем узмацніць працу па нарыхтоўцы і закупе сыравіны. Бо, нягледзячы на тое, што два тыдні таму адбылася рэспубліканская нарада па гэтым пытанні, праблема застаецца:

— Яскравы прыклад — Гродзенскі кансервавы завод. Выдатнае прадпрыемства пасля мадэрнізацыі. Ёсць сучасныя лініі па перапрацоўцы ягаднай, костачкавай сыравіны, але на жаль, сёлета ніводнага кілаграма ягад не было перапрацавана. І не трэба тут вінаваціць сельскі савет ці «Белкаапсаюз». Кіраўнік прадпрыемства павінен разумець, што гэта найперш яго праца. Калі не загружана прадпрыемства, адкуль фарміраваць фонд заработнай платы?

Акрамя таго, Іван Бамбіза праінфармаваў, што ў межах выканання Указа аб развіцці Палескага рэгіёна 24-25 верасня ў аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна пройдзе фестываль «Кліч Палесся». Яго мэтай стане прыцягненне ўвагі да рэгіёна турыстычных кампаній, бізнэсменаў і інвестараў. «Гэта выдатныя мясціны не толькі з унікальнымі прыроднымі рэсурсамі, але і з самабытнымі традыцыямі і абрадамі. Мы павінны паказаць Палессе ва ўсёй яго прыгажосці», — сказаў Іван Бамбіза.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ЖНІВЕНЬСКІ ЯБЛЫКАПАД

— У нас на Гомельшчыне вытворчыя лініі не прастойваюць, — запэўнівае генеральны дырэктар гомельскага абласнога КУП харчовай прамысловасці «Гомельаблхарчпрам» Сяргей Рахоўскі. — Звычайна сезон нарыхтоўкі цягнецца з жніўня па кастрычнік. Але сёлета анамальнае надвор'е сваю справу зрабіла, і ў кастрычніку яблыкаў можа не быць. Таму мы зараз узмоцненымі тэмпамі імкнёмся перапрацаваць яблыкі.

Чэргі на здачу сыравіны ля вінзаводаў у гэты час ствараюцца заўсёды. Сёлета не выключэнне, хоць гэты працэс рэгулююць у тым ліку ў Гомельскім абласным саюзе спажывецкіх таварыстваў, расказвае **начальнік управлення нарыхтовак гэтай арганізацыі Васіль ВІННІКАЎ**:

— Мы на сённяшні дзень нарыхтавалі 16200 тон яблыкаў. Летась на гэтую дату было амаль 100 тысяч тон. Каб стымуляваць насельніцтва, дамовіліся з вінзаводамі, што закупачная цана ў нас павінна быць для насельніцтва 150 рублёў за кг. Сёлета яблыкаў вельмі шмат, і людзі зацікаўленыя ў здачы, гэта выгадна для насельніцтва. Толькі Гомельскае райпо сёлета паспела нарыхтаваць 2200 тон. Яблыкі ідуць на вінзаводы, але мы закупляем ад насельніцтва і таварны яблык, каб ён быў у гандлёвай сетцы. Нельга працаваць толькі на вінзавод, бо тады на рынку на яблыкі цэны могуць «узляцець». У нас заданне сёлета — нарыхтаваць 14900 тон. Мы яго выканалі і перавыканалі. Думаю, што каля 8-9 тысяч тон мы яшчэ нарыхтуем да канца сезона.

— Як арганізаваны працэс куплі яблыкаў ад насельніцтва?

— Сёлета ў Гомелі мы арганізавалі закупку яблыкаў праз пункты прыёму другаснай сыравіны, іх у Гомелі 22. Цяпер пра гэта ведаюць практычна ўсе — была пэўная рэклама. Што тычыцца вёскі, то ў нас арганізавана работа праз гандлёвыя прадпрыемствы, плюс працуюць раз'язныя нарыхтоўшчыкі. Ездзім, збіраем, здаём на вінзаводы. Сёлета нядрэнны ўраджай яблыкаў, паглынуць іх перапрацоўчыя прадпрыемствы не могуць адначасова, таму мы працуем і з іншымі абласцямі, напрыклад, з Віцебскай, дзе яблыкі паспяваюць на 2 тыдні пазней. Такім чынам падаўжаем сезон нарыхтоўкі і перапрацоўкі. Нарыхтоўка не толькі не прыпыняецца, яна будзе працягвацца.

— Прадпрыемствы ўсё могуць узяць, што вы ім прапануеце?

— Калі нейкі вінзавод становіцца на прафілактыку на 3 дні, чаго патрабуе тэхналогія, мы перанакіроўваем сыравіну на іншыя перапрацоўчыя прадпрыемствы, у тым ліку ў Віцебскую, Мінскую вобласці. Я магу з усёй адказнасцю сказаць, што працэс нарыхтоўкі яблыкаў арганізаваны і ёсць зладжанасць працы паміж нашай арганізацыяй і перапрацоўчымі прадпрыемствамі.

Тое ж самае сцвярджае і **дырэктар гомельскага абласнога КУП харчовай прамысловасці «Гомельаблхарчпрам» Сяргей РАХОЎСКІ**:

— Ніякіх праблем з сыравінай няма. Проста яблыкаў сёлета вельмі шмат, і 4 нашы вінзаводы цалкам загружаныя — свабодных ёмістасцяў проста няма. Сёння ўсе перапрацоўчыя прадпрыемствы працуюць на поўную магутнасць. Мы бесперапынна прымаем яблыкі, але іх сёлета больш, чым мы можам перапрацаваць. Калі летась за жнівень было перапрацавана 8 тысяч тон, то сёлета ўжо ёсць 10,5 тысячы тон. Мы набываем яблыкі ў прадпрыемстваў спажывецкай кааперацыі па цэнах да 250 рублёў за кг. Гэта сярэдняя цана мінулага года. Сёлета многа падманкі, якасць яблыкаў не самая лепшая, але яблыкаў так шмат, што яны ў поўнай меры забяспечаць сыравінай усе нашы прадпрыемствы.

На Ельскім кансервавым заводзе толькі-толькі ўведзена новая італьянская лінія па вырабе асэптычнай прадукцыі з самай рознай сыравіны. У гэты момант яна «паглынае», зразумела, яблыкі. Гаворыць **намеснік дырэктара Ельскага кансервавага завода Мікалай ТРАФІМАЎ**:

— Загружаны поўнасцю, яблыкаў дастаткова. Асэптычнае пюрэ робім — гэта паўфабрыкат для далейшай перапрацоўкі ў зімовы час. З яго потым атрымліваем нектары з мякаццю, сокі. Сыравіну купляем праз райпо. Адсутнасць фінансавых сродкаў не дазваляе нам самім закупляць яблыкі. Разлічваемся са спажывецкімі арганізацыямі гатовай прадукцыяй. Працуем у графіку — ніякіх праблем з пастаўкай сыравіны няма. Хутка пойдуць морква і гарбузы. Нектары з іх пачалі карыстацца пэўным попытам апошні час. Праўда, планы па зялёным гарошку нам сарвала надвор'е. Разлічвалі на лепшае, думалі атрымаць каля 1000 тон. На жаль, толькі 550 тон атрымалася. Але якасць прадукцыі нармальная.

Лета, якое набліжаецца да фіналу, дазволіла, нягледзячы на ўсе вядомыя цяжкасці, нарыхтаваць у запас і іншыя дарункі прыроды, адзначае начальнік упраўлення нарыхтовак Гомельскага абласнога саюза спажывецкіх таварыстваў Васіль Віннікаў:

— Сёлета, як вядома, было больш хуткае выспяванне суніцы садовай і меншы яе ўраджай — гэта не дазволіла нарыхтаваць вялікую колькасць ягады. Нельга сказаць, што мы штосьці не забралі з таго, што было вырашчана. Трэці год запар актыўна прадавалі на рынках і ў крамах чарніцы — гэта дазволіла значна знізіць цану на ягаду і не даць разгуляцца прыватнікам. Прадавалі па цане ад 7 да 10 тысяч рублёў за кг. Мы будзем такі вопыт распаўсюджваць і надалей. Закупачныя цэны былі выгаднымі для нашых пункцікаў. Чарніцы — ад 6 тысяч і вышэй. Мы адсочвалі цэны камерцыйных структур і там, дзе яны плацілі 6 тысяч, мы давалі 6200. Сёлета нарыхтавалі 450 тон чарніц — гэта менш, чым летась на 100 тон. Магло б быць больш, каб не такое спякотнае лета. Частку ягад мы адгрузілі на экспарт — на 27 % больш, чым летась. У асноўным у Польшчу і краіны Прыбалтыкі. Ёсць у нас і свае цэхі замарозкі. За асабістыя сродкі пабудавалі, усталявалі вялізны халадзільнік модульнага тыпу па шокавай замарозцы ягад у Светлагорскім райпо. Да гэтага такія ж халадзільнікі былі ўсталяваныя ў Жыткавіцкім, Лельчыцкім, Петрыкаўскім і Акцябрскім раёнах — там, дзе ёсць рэсурсы і масавае паступленне ягад. Бо на экспарт у нас бяруць ягады толькі ў замарожаным выглядзе.

Такім чынам, нарыхтоўчыя прадпрыемствы Гомельшчыны працуюць з думкай пра зіму, і без кансерваваных прадуктаў мы не павінны застацца. Тым больш што ёсць пэўныя леташнія запасы. Ну і кожная гаспадыня прыхавала ў склепе тое-сёе. Перазімуем!

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Жыццё пражыць — не кошык сплесці

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Грамадская прыёмная

КАБ ГОРАД ПРЫГАЖЭЎ

Намеснік старшыні Брэсцкай абласной арганізацыі РГА «Белая Русь» Васіль Лашч правёў прыём грамадзян у Жабінцы. Яшчэ да прыёму ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» Васіль Васільевіч адзначыў, што жабінкаўская арганізацыя працуе даволі плённа. За два месяцы актывісты арганізацыі накіравалі шэраг прапаноў раённай уладзе па добраўпарадкаванні горада і сельскіх населеных пунктаў. Раённая арганізацыя таксама дапамагла купіць мясцовай ЖКГ катамараны, і цяпер адпачынак у гарадскім парку стаў больш разнастайным і змястоўным. Моладзь, бацькі з дзецьмі з задавальненнем катаюцца па возеры на катамаранах пад сцягамі арганізацыі «Белая Русь».

Дарэчы, пытанне па далейшым добраўпарадкаванні парку ўзнікла на ўчарашнім прыёме. Група грамадзян выказала просьбу паспрыяць будаўніцтву дзіцячай кавярні, невялікіх атракцыёнаў, іншых аб'ектаў для цікавага і актыўнага адпачынку.

Грамадзянін Дулевіч, жыхар дома па вуліцы Чарнака, прынёс калектыўны зварот ад імя сваіх суседзяў. Справа ў тым, што на вуліцы няма ліўневай каналізацыі, і вясной, восенню, пасля моцных дажджоў улетку дарога часта бывае залітая вадой, вада заходзіць і на падворкі. Зразумела, што людзі хочуць, каб на іх вуліцы праклалі адпаведныя каналізацыйныя сеткі. Варта адзначыць, што такія праблемы маюць не толькі жыхары названай вуліцы. Уся Жабінка стаіць на балоце, таму падчас паводкі церпяць многія гараджане. Таксама з просьбамі па добраўпарадкаванні сваіх кварталаў прыйшлі на прыём жыхары дамоў па вуліцы Саўгаснай, завулка Рабочы.

Як заўважыў Васіль Лашч, сустрэчы з людзьмі кіраўнікоў грамадскай арганізацыі праводзяцца перш за ўсё як маніторынг сацыяльна значных праблем. Пасля прыёму ў Жабінцы ўсе звароты будуць належным чынам аформленыя. Актывісты арганізацыі маюць намер удакладніць у органах улады, ці стаяць агучаныя праблемы ў планах работы на бліжэйшы час, на якім этапе іх вырашэнне, якія тэрміны названыя. Калі ж мерапрыемствы ў планы не ўключаны, то дэпутаты, члены грамадскага аб'яднання, пастараюцца праз свае прадстаўнічыя органы дабіцца пастаноўкі пытанняў на парадак дня адпаведных пасяджэнняў і сесій для іх вырашэння.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЗАРОБКІ ПЛАЦЯЦЬ НЕЗАЛЕЖНА АД ПРАБЛЕМ

Статыстыка сведчыць, што ў Беларусі амаль не адзначаюцца выпадкі пратэрмінаванай запазычанасці па зарплаце. Разам з тым, заўважаюць у камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, па-ранейшаму застаюцца праблемы з канчатковымі разлікамі пры звальненні. Прычым перш-наперш яны адзначаюцца ў арганізацыях прыватнай формы ўласнасці.

Заканадаўства абавязвае найманага работніка выплачваць заробкі рэгулярна ў дні, якія вызначаны ў калектыўным дагаворы, пагадненні або ў працоўным дагаворы — і да таго ж не радзей, чым раз у месяц. Пры гэтым існуе правіла: у выпадку, калі дзень выплат прыпадае на выхадныя, дзяржаўныя святы ці святочныя дні, то разлік робіцца напярэдадні. Словам, умовы нібыта вядомыя. Аднак на практыцы здараецца, што разлікі праводзяцца не цалкам і несвоечасова — са спасылкай на фінансавыя праблемы.

Варта заўважыць, што для забеспячэння выплаты заробкаў, гарантыйных і кампенсацыйных выплат у выпадку эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва) ці ліквідацыі арганізацыі наймальнікі павінны стварацъ рэзервовы фонд зарплаты. Апроч таго, наймальнік абавязаны ў бясспрэчным парадку «браніраваць» для разліку з работнікамі сумы, якія адпавядаюць 1,5 бюджэту пражыткавага мінімуму, скарэктаванага на індэкс спажывецкіх цэн.

— На сёння гэта сума складае 442,1 тыс. рублёў на чалавека, прычым зразумела: узровень заробкаў па сталіцы адчувальна вышэй, — заўважае **намеснік начальніка аддзела працы і зарплаты камітэта Яўген КАЗАКЕВІЧ**. — Таму трэба падкрэсліць: выплата 1,5 БПМ не пазбаўляе арганізацыю абавязку разлічыцца па зарплаце цалкам.

Што да канчатковага разліку пры звальненні, то наймальнік павінен правесці яго непасрэдна ў дзень звальнення або, калі работнік у гэты дзень не працаваў, то не пазней за наступны дзень пасля прад'яўлення патрабавання аб разліку. Аднак, на жаль, так адбываецца не заўсёды. І па той жа прычыне — некаторыя нядобрасумленныя наймальнікі спасылаюцца на фінансавыя цяжкасці, абяцаюць разлічыцца пазней. І часцяком такія абяцанні застаюцца толькі словамі.

— Заканадаўства прадугледжвае адказнасць за несвоечасовы разлік пры звальненні — работнік можа атрымаць свой сярэдні заробак за кожны дзень пратэрміноўкі, — падкрэслівае Яўген Казакевіч. — Прычым гэтае пытанне на працягу трох месяцаў трэба вырашаць у судзе па месцы рэгістрацыі арганізацыі. Таксама на працягу трох месяцаў магчыма звярнуцца ў суд і ў выпадку, калі не выплачваецца зарплата. І, дарэчы, плаціць судовую пошліну пры разглядзе індывідуальных працоўных спрэчак не прыйдзецца.

Між тым яшчэ адна няпростая тэма падчас фінансавых цяжкасцяў арганізацый — калектыўныя дагаворы. Паўсюль яны розныя, але разам з тым іх аб'ядноўвае адно — вызначэнне дадатковых гарантый работнікам. Ці магчыма з улікам няпростага становішча гэтыя гарантыі зменшыць?

— У большасці калдагавораў прадугледжваецца норма, паводле якой у сувязі з пагаршэннем фінансавага становішча прадпрыемства выплаты матэрыяльнай дапамогі і прадстаўленне дадатковых ільготаў работнікам могуць быць зменшаныя ці ўвогуле скасаваныя — за выключэннем дапамог і льготаў, якія прадугледжае заканадаўства, — заўважае Яўген Казакевіч. — Такое дапускаецца. Аднак у такім выпадку для таго, каб пазбегнуць канфліктаў паміж работнікамі і адміністрацыяй прадпрыемстваў, мы ўсё ж рэкамендуем загадзя вызначаць у тых жа калдагаворах канкрэтныя ўмовы змяншэння ці скасавання тых ці іншых выплат.

Сяргей ГРЫБ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БЛОГЕРЫ СМЯЮЦЦА: МЯДЗВЕДЗЕВА «ДАРАСЦІЛІ» ДА БОНА, КАБ НЕ ГАНЬБІЦЬ ЯГО НА ФОТА

Апублікаваныя ў прэсе фотаздымкі сустрэчы ў Сочы прэзідэнта РФ з лідарам ірландскай групы U2 Бона прымусілі блогераў гаварыць пра хітрыкі рэпарцёраў, як зрабіць расійскага прэзідэнта вышэй, піша «Новы рэгіён».

На адным з фотаздымкаў, дзе Мядзведзеў і Бона ідуць па набярэжнай, насамрэч выразна відаць, што ніякай розніцы ў росце паміж расійскім лідарам і музыкам няма. У той жа час рост Мядзведзева складае ўсяго 162 см, а Бона — на цэлых 13 см вышэй. Блогер shatkin прапануе параўнаць, які на здымку Бона «шырокі», а Мядзведзеў «вузкі». «Аднаго, я мяркую, уціснулі, другога выцягнулі», — лічыць інтэрнэт-карыстальнік.

Раней вылучаліся версіі, што пры здымцы Мядзведзева ўжываецца як «фоташоп», так і прынцыпы аптычнай ілюзіі. Так, журналісты імкнуцца здымаць нізкарослага расійскага прэзідэнта знізу, а ў асяроддзі іншых людзей раяць яму стаяць на крок наперадзе. На яшчэ адным здымку з Сочы, дзе Мядзведзеў вітае поціскам рукі Бона, ён узвышаецца над 175-сантыметровым музыкам амаль на галаву. І хоць на фота ва ўдзельнікаў сустрэчы адрэзаны ногі, па ніжнім краі відаць, што расійскі лідар стаіць на прыступцы.

Пра высокі выгляд расійскага прэзідэнта на фотаздымках СМІ пісалі і падчас яго нядаўняга візіту ў ЗША, калі Мядзведзева знялі побач з губернатарам Каліфорніі Арнольдам Шварцэнегерам. Пры росце 185 см выканаўца ролі Тэрмінатара дзіўным чынам не ўзвышаўся над расійскім прэзідэнтам.

Гэтыя фатаграфіі прымусілі казаць пра хітрыкі, да якіх звяртаецца як сам расійскі лідар, так і фотаграфы. Па некаторых звестках, Мядзведзеў носіць туфлі на абцасе вышынёй да 5-6 см. Не выключана, што ў іх ёсць і ўтоены абцас у 2-3 см.

РАХМОН ЗАКЛІКАЎ ТАДЖЫКАЎ ЗАКУПІЦЦА ПРАДУКТАМІ НА ДВА ГАДЫ НАПЕРАД

Кіраўнік Таджыкістана Эмамалі Рахмон заклікаў жыхароў краіны запасціся прадуктамі харчавання на бліжэйшыя два гады. Пра гэта прэзідэнт заявіў падчас працоўнай паездкі ў Хатлонскую вобласць.

З-за засухі і будучага росту коштаў на збожжа прэзідэнт загадаў кожнай сям'і мець двухгадовы запас пшаніцы. Рахмон таксама заклікаў назапасіцца і іншымі харчовымі прадуктамі. Прэзідэнт заявіў, што кошты на збожжа ў Таджыкістане ўжо выраслі. Ён таксама падкрэсліў, што харчовы рынак краіны ў значнай ступені залежыць ад імпарцёраў, што можа прывесці да новых зменаў коштаў на збожжа і зніжэння пакупной здольнасці.

Як адзначаюць інфармагенцтвы, на гэты момант сярэднямесячны заробак у Таджыкістане складае 330 самані (75,14 долара). Пры гэтым 50 кілаграмаў пшаніцы каштуюць каля 100 самані. Каб пакрыць патрэбы краіны, Таджыкістану неабходна 1,4 мільёна тон збожжавых. Каля 1 мільёна тон краіна вырошчвае самастойна, астатняе імпартуе з Расіі і Казахстана.

У АФГАНІСТАНЕ КАНФІСКАВАНА НАЙБУЙНЕЙШАЯ Ў ГІСТОРЫІ ПАРТЫЯ НАРКОТЫКАЎ

Кааліцыйныя сілы ў Афганістане ў час ліпеньскай спецаперацыі канфіскавалі найбуйнейшую ў гісторыі партыю наркотыкаў. Пра гэта паведамляе Metro.

Рэйд праводзіўся ў правінцыі Гільменд у раёне населеных пунктаў Бахрамча і Хаджы Вакіл сумесна з афганскай паліцыяй. Падчас аперацыі было канфіскавана 5,7 тоны гераіну, 11,3 тоны опію і больш за 800 кілаграмаў гашышу. Агульны кошт канфіскаваных наркотыкаў перавышае мільярд долараў.

Пры правядзенні рэйду было знішчана 63 баевікі, дзесяць узброеных паўстанцаў і гандляроў наркотыкамі арыштаваны. Акрамя таго, падчас аперацыі была канфіскавана значная колькасць выбуховых рэчываў, а таксама 4,5 тоны хларыду амонію, які выкарыстоўваецца для атрымання гераіну з опію.

Былы кіраўнік службы па кантролі за абарачэннем наркотыкаў у правінцыі Гільменд Філіпа Браун заявіў, што канфіскаваная партыя роўная прыкладна 25—30 працэнтам ад колькасці гераіну, які пастаўляецца ў Вялікабрытанію за год. Браун таксама адзначыў, што, знішчаючы плантацыі маку і канапель, улады ў якасці альтэрнатывы бясплатна раздаюць мясцовым жыхарам насенне пшаніцы, вінограду і пладовых дрэў.

ТРЭЦЬ РАСІЯН ЧАКАЮЦЬ НОВАГА СПАДУ Ў ЭКАНОМІЦЫ

Каля 36 працэнтаў расіян з тых, якія прынялі ўдзел у жнівеньскім апытанні Усерасійскага цэнтра даследавання грамадскай думкі (УЦДГД), мяркуюць, што ў наступныя 12 месяцаў эканоміку краіны чакаюць змены да горшага. Вынікі апытання прыводзяцца на афіцыйным сайце цэнтра. У маі такое меркаванне падзялялі 24 працэнты рэспандэнтаў.

У спрыяльную будучыню для расійскай эканомікі вераць 41 працэнт апытаных. У маі гэты паказчык дасягаў 48 працэнтаў. На пытанне пра перспектывы эканамічнага сектара не змаглі адказаць 23 працэнты рэспандэнтаў (у маі — 28 працэнтаў).

У паведамленні падкрэсліваецца, што найбольш аптымістычнымі аказаліся расіяне, якія пражываюць у Паўднёвай федэральнай акрузе. У пазітыўныя тэндэнцыі таксама вераць матэрыяльна забяспечаныя грамадзяне і жыхары гарадоў з насельніцтвам звыш 500 тысяч чалавек.

Негатыўна ўспрымаюць будучыню эканомікі расіяне з Цэнтральнай і Уральскай акруг, з Масквы і Санкт-Пецярбурга, а таксама малазабяспечаныя людзі. У лістападзе і жніўні аналагічныя апытанні правялі «Левада-Цэнтр» і партал SuperJob.ru. Вынікі іх даследавання паказалі, што дзве трэці расіян не вераць у заканчэнне крызісу.

Казімір ФАРЫНО:

Зала калегіі

«Вялікая колькасць непатрэбных папер адцягвае ўвагу настаўніка ад вучня»

Як спыніць бюракратычны папяразварот у школе? Ці заўсёды апраўдваюць сваё існаванне навучальныя ўстановы новага тыпу — гімназіі і ліцэі? Як вырашаюцца кадравыя праблемы адукацыйнай галіны? Каму кіраўнік навучальнай установы павінен аддаць перавагу: вопытнаму настаўніку-пенсіянеру ці маладому спецыялісту? А каму аддаюць перавагу вучні? Гэтыя пытанні адрасаваў удзельнікам калегіі, якая прайшла ўчора ў сценах галоўнага адукацыйнага ведамства, міністр адукацыі нашай краіны Аляксандр Радзькоў. Калегія была прысвечана падрыхтоўцы нацыянальнай сістэмы адукацыі да новага навучальнага года.

— Якасць адукацыі фарміруецца ў працэсе педагагічнага ўзаемадзеяння настаўніка і вучня, — упэўнены намеснік міністра адукацыі Казімір Фарыно. — І асноўная функцыя настаўніка — вучыць дзяцей, таму **трэба вызваліць яго ад выканання ўсіх неўласцівых яму функцый, у тым ліку ад напісання шматлікіх даведак і справаздач**. Вялікая колькасць дакументацыі, якую даводзіцца афармляць педагагічным работнікам, з'яўляецца сур'ёзнай праблемай для ўстаноў адукацыі. Для прыкладу, гадавы план школы можа ўтрымліваць ад 45 да 50 дадаткаў, якія дубліруюць сам план. Гэта прыводзіць да неабгрунтаванага павелічэння аб'ёму дакументацыі.

Казімір Фарыно канстатаваў, што адсутнічае зацверджаны пералік ведамаснай справаздачнасці, і калі прааналізаваць бюракратычны папяразварот на прыкладзе нейкай канкрэтнай школы, то можна пераканацца, што ўклад Міністэрства адукацыі ў яго — мінімальны. Самая вялікая колькасць розных папер прыходзіць не з Міністэрства адукацыі, не з упраўленняў адукацыі аблвыканкамаў, а з райвыканкамаў. У многіх выпадках справаздачы рыхтуюцца ўвогуле на падставе вусных распараджэнняў работнікаў органаў кіравання адукацыяй ці пісьмовых указанняў зверху. Пры гэтым справаздачы носяць пераважна інфармацыйны характар і не могуць выкарыстоўвацца для аналізу якасці адукацыйнага працэсу. «Я лічу, што гэтая інфармацыя ў большай ступені з'яўляецца схаванай формай пастаяннага кантролю кіруючых структур за работай устаноў адукацыі па розных напрамках дзейнасці, — рэзюмаваў Казімір Фарыно. — Хачу паведаміць, што Міністэрствам адукацыі падрыхтаваныя метадычныя рэкамендацыі па распрацоўцы гадавога плана і падрыхтоўцы справаздачнасці. Спадзяюся, што іх выкананне дазволіць выключыць залішнюю бюракратыю на месцах».

Сёння ў агульнаадукацыйных установах краіны працуе 110 770 настаўнікаў, 91 працэнт з іх маюць вышэйшую адукацыю, а 74 працэнты — першую і вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыі. У мінулым навучальным годзе ў школах працавала амаль 8 тысяч педагогаў, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, што складае 7 працэнтаў ад агульнай колькасці. Сёлета ў сістэму адукацыі накіравана больш за 5 тысяч маладых спецыялістаў. Разам з тым ва ўстановах адукацыі не хапае настаўнікаў фізікі, інфарматыкі, матэматыкі, і гэта пры тым, што выпуск гэтых спецыялістаў тэарэтычна адпавядае патрэбам устаноў адукацыі. Але практычна менавіта спецыялісты гэтых профіляў не затрымліваюцца ў школе. Як прызналася дырэктар Вішоўскай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы Бялыніцкага раёна Кацярына Зайцава, у школе затрымліваюцца пераважна толькі дзяўчаты, а хлопцы пасля двух гадоў адпрацоўкі па размеркаванні, як правіла, пакідаюць школу ў пошуках больш высокааплатнай работы.

Сёлета конкурс у асобныя гімназіі склаў ад 1 да 1,1 чалавека на месца. Пры такім «конкурсе» працэдура ўступных іспытаў ператвараецца ва ўмоўнасць...

У апошнія гады акрэсліўся таксама востры дэфіцыт работнікаў дашкольных устаноў, што звязана з іх нізкім сацыяльным статусам. «Мы лічым, што педагогі дашкольных устаноў павінны быць прыраўнаваныя да школьных настаўнікаў і ў аплаце іх працы, і ў працягласці водпуску, — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў, — паколькі іх уклад у выхаванне падрастаючага пакалення зусім не меншы...» Па-ранейшаму ў сістэме

Леанід Сасноўскі:

«ТРЫБАФАТЫКА — ГЭТА ІНАВАЦЫІ Ў НАВУЦЫ, АДУКАЦЫІ, ТЭХНАЛОГІЯХ»

— Велізарная! З самага пачатку і да сённяшняга дня ён рабіў і робіць усё, каб падтрымаць і развіваць гэты перспектыўны раздзел механікі сваім высокім аўтарытэтам.

— Цяжка не пагадзіцца і з акадэмікам НАН Беларусі, акадэмікам Міжнароднай АН Еўразіі, доктарам тэхнічных навук, прафесарам, заслужаным дзеячам навукі РБ, першым намеснікам Старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2005) Пятром Аляксандравічам Віцязем. Ён сказаў: «Гэты новы навуковы напрамак... даказаў велізарную навуковую і практычную значнасць праблем вывучэння комплекснага ўзаемадзеяння элементаў у механічных сістэмах і метадаў кіравання іх пашкоджаннямі». Падтрымка вучонага такога ўзроўню нямала значыць.

— Вось толькі адзін факт. Менавіта дзякуючы Пятру Аляксандравічу Віцязю рэалізаваны праект стварэння *(па-мойму, упершыню ў Беларусі) Міжведамаснай лабараторыі «ТРЫБАФАТЫКА» з мэтай распрацоўкі міждысцыплінарных праблем у сферах навука — вытворчасць — адукацыя. Навуковыя і практычныя дасягненні гэтай лабараторыі, думаю, шырока вядомыя. Дадам, што ініцыятарамі стварэння лабараторыі выступілі такія вядомыя навукоўцы і спецыялісты рэспублікі, як член-карэспандэнт Л.Г. Краснеўскі, прафесар, д.т.н. В.І. Сянько, к.т.н. В.А. Жмайлік і інш. Падобныя водгукі буйных вучоных аб трыбафатыцы садзейнічалі вельмі хуткаму яе прызнанню ў Беларусі і за яе межамі. Дзякуй, што вы з такой цікавасцю паставіліся да гэтай тэмы.

— Бадай, што мы дастаткова пагаварылі аб прыхільніках. Пяройдзем да апазіцыі?

АПАЗІЦЫЯНЕРЫ

— Вядомы французскі пісьменнік і філосаф-асветнік Вальтэр неяк сказаў: ніколі не бывае вялікіх спраў без вялікіх цяжкасцяў. Не сумняваемся, што нараджэнне новай навукі праходзіла калі не ў муках, дык у дыскусіях, складанасцях, цяжкасцях, праблемах і г.д.

— Усё новае нараджае прыхільнікаў, энтузіястаў з аднаго боку і праціўнікаў, апазіцыянераў — з другога. У навуцы, як і ў палітыцы, ёсць два тыпы апазіцыі: канструктыўная і непрымірымая. Першая вельмі карысная: гэта — рацыянальная крытыка. Мы заўсёды ўдзячныя вучоным, якія выяўляюць тыя ці іншыя недахопы ў нашых работах, бо пераадоленне іх прыводзіць да ўдасканальвання вынікаў даследаванняў, асэнсавання іх асаблівасцяў з новых пазіцый. І нават калі тая ці іншая заўвага апанентаў па сутнасці памылковая — яна ўсё роўна карысная: мы знаходзім новыя і больш пераканаўчыя аргументы для пацвярджэння вынікаў, якія крытыкуюць. Ну а што датычыць непрымірымай апазіцыі — яна проста непрыемная.

— Дык што ж гэта такое — непрымірымая апазіцыя?

— А гэта такія асобы, у чым іх не пераконвай, што не паказвай, усё роўна, нягледзячы на факты і вынікі навуковых даследаванняў, стаяць на сваім: дрэнна, няправільна, лухта. А чаму так — не скажуць аргументавана. Дарэчы, за мяжой, па маіх звестках, такіх няма, а ў Беларусі я ведаю толькі трох.

— Мяркуем, што пасля тых практычных спраў, якія ажыццёўлены ў розных галінах вытворчасці, правядзення шэрагу самых сур'ёзных даследаванняў прыхільнікамі трыбафатыкі, катэгорыя непрымірымых апазіцыянераў усё ж- такі ператварылася ў катэгорыю простых апазіцыянераў, апанентаў?

— Яны таму і непрымірымыя, што непрымірымыя...

АДУКАЦЫЯ

— Давайце, Леанід Адамавіч, паразважаем пра наступнае. Вось рэальнае жыццё: з аднаго боку — новыя вынікі ў навуцы і прызнанне, а з другога — апазіцыя, у тым ліку і непрымірымая. А ў выніку барацьбы гэтых супрацьлегласцяў пракладваецца шлях угору: трыбафатыка як новая галіна ведаў. Ці маглі б вы гэтую агульную думку праілюстраваць прадметна?

— Паспрабую. У тэхнічных навуках рэальнае прызнанне дасягненняў — гэта, вядома ж, укараненне іх у вытворчасць, бо размова тут ідзе пра матэрыяльную карысць. Але калі новыя навуковыя ідэі і вынікі становяцца прадметам для вывучэння ва ўніверсітэтах — гэта ўжо найвышэйшае прызнанне іх значнасці, бо яны з'яўляюцца новымі ведамі ў тэхнічнай сферы грамадства.

Калі шмат гадоў таму дэкан механічнага факультэта Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту прафесар Веньямін Іванавіч Сянько прапанаваў (вельмі нечакана для многіх) увесці асобны курс «Асновы трыбафатыкі» ў вучэбныя планы інстытута для падрыхтоўкі будучых інжынераў-механікаў, што тут пачалося! Барацьба думак, сумненняў, пазіцый, амбіцый была нежартоўнай — жорсткай. Але прафесар Сянько выстаяў — двойчы ішоў у «наступ», так бы мовіць. Спачатку на Савеце факультэта, а затым і на вучоным савеце інстытута (пазней ён быў ператвораны ва ўніверсітэт — БелДУТ і прафесар В.І. Сянько стаў яго рэктарам). А сёння курс па трыбафатыцы чытаецца ў пяці ўніверсітэтах краіны, у тым ліку і ў першым з іх — БДУ, гэта была ініцыятыва першага прарэктара гэтай ВНУ д.ф.-м.н. М.А. Жураўкова. І зараз створаны поўны камплект вучэбна-метадычнай літаратуры, у тым ліку 2-томны вучэбны дапаможнік, зацверджаны Міністэрствам адукацыі РБ.

— Вы сказалі: у пяці ВНУ. Але іх у нас у краіне больш за дзясятак...

— Гэта так. Але працэс пайшоў. І калі ў некаторых універсітэтах пакуль яшчэ не зусім усвядомілі... бадай што, не буду працягваць, скажу толькі наступнае: гэта не праблема трыбафатыкі, гэта іх праблема... і праблема сучасных ведаў іх студэнтаў.

МІЖНАРОДНЫЯ СІМПОЗІУМЫ

— Нам, Леанід Адамавіч, здаецца, што нялішне будзе сказаць пра тое, што прайшло ўжо, пачынаючы з 1993 года, пяць міжнародных сімпозіумаў па трыбафатыцы ў Гомелі, Маскве, Пекіне, Цярнопалі і Іркуцку, і што ў гэтай галіне атрыманы фундаментальныя вынікі, якія там абмяркоўваліся. А што будзе на сімпозіуме ў Мінску?

— Абмеркаванне новых ідэй спецыялістамі, якія з'явяцца стымулам для далейшага развіцця даследаванняў па трыбафатыцы і арганізацыі міжнароднага супрацоўніцтва ў гэтай перспектыўнай галіне, якая мае вялікае практычнае значэнне.

— Нам вядома таксама, што на сімпозіуме ў Мінску вы будзеце чытаць спецыяльную лекцыю, прысвечаную развіццю даследаванняў у новай галіне ведаў — трыбафатыцы, што некаторыя вучоныя на ім будуць узнагароджаныя: Ганаровым дыпломам «За ўклад у развіццё трыбафатыкі» і ганаровым юбілейным знакам «Трыбафатыка-25». А што гэта за ўзнагароды?

— Ганаровым дыпломам на сёння ўзнагароджана 120 вучоных розных краін. У тым ліку 16 з Беларусі. Традыцыю ўзнагароджанняў мы пачалі з 1996 г., калі ў Маскве праходзіў II Міжнародны сімпозіум па трыбафатыцы. Сёлетні сімпозіум у Мінску — юбілейны, і мы плануем узнагародзіць 25 вучоных спецыяльным юбілейным ганаровым знакам (ён выкананы ў метале), як прызнанне асаблівых заслуг перад трыбафатыкай. І, вядома, прадоўжым традыцыю ўручэння Ганаровых дыпломаў.

У КІЁТА ЗДЗІЎЛЯЛІСЯ...

— Леанід Адамавіч, раскажыце, што адбывалася ў гэтым японскім горадзе?.

— Летась вытворчае аб'яднанне «Гомсельмаш», з якім мы плённа супрацоўнічаем, і ТАА «НВА «ТРЫБАФАТЫКА» ажыццявілі сумесны праект «Сюрпрызы трыбафатыкі» для IV Сусветнага кангрэса па трыбалогіі, які праходзіў у кастрычніку ў Японіі. Пра ўзровень яго сведчаць наступныя факты. Кангрэс адкрыў спадчынны прынц гэтай краіны. На форуме было прадстаўлена каля тысячы дакладаў больш за дзве тысячы аўтараў; адначасова працавала некалькі навуковых сесій і спецыяльная выстава «Будучыня трыбалогіі».

Даючы наказ нашай групе з шасці чалавек, генеральны дырэктар «Гомсельмаша» Валерый Жмайлік падкрэсліў, каб мы памяталі, што прадстаўляем там не толькі ўказаныя прадпрыемствы, а і навуку і тэхналогіі Рэспублікі Беларусь, што па тых работах, якія мы прадэманструем, сусветная навуковая супольнасць будзе ацэньваць узровень і вартасць нашай інавацыйнага выпрабавальнага абсталявання — машын серыі СІ. Буйнейшыя замежныя фірмы, якія спецыялізуюцца на пастаўках выпрабавальнай тэхнікі сусветных вытворцаў, прапанавалі свае паслугі нам па прасоўванні нашых машын на рынак.

Асаблівую цікавасць у іх выклікалі наступныя экспанаты: зубчатыя колы дыяметрам каля 0,5 метра для бартавога рэдуктара ўніверсальнага энергетычнага сродку (УЭС-250) вытворчасці «Гомсельмаша» і адрэзак цяжкай чыгуначнай рэйкі Р-65. Па той прычыне, што яны былі зробленыя... з высокатрывалага чыгуну.

— З чыгуну?!

— Менавіта так. Спецыялістам добра вядома, што чыгун не можа супернічаць са сталлю, калі размова ідзе пра адказныя цяжканагружаныя дэталі і вузлы, бо супраціўленне стомленасці пры згібе і зносастойкасці пры трэнні качэння ў яго прынамсі на 30—40 працэнтаў ніжэй. Але нашы спецыялісты на выставе ў Кіёта ўнеслі важную папраўку: чыгун можа супернічаць са сталлю! Вось ён, створаны вучонымі і практыкамі таварыства з абмежаванай адказнасцю «НВА «ТРЫБАФАТЫКА» і вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш». І гэта не галаслоўная заява. Нашы вучоныя-гіды расказвалі зацікаўленым, што было зроблена 35 плавак чыгуну (у тым ліку 10 паўпрамысловых, і атрыманы чыгун, які па сваіх якасцях амаль не саступае найбольш трывалым маркам сталі.

У гутарку ўступае малады вучоны, кандыдат тэхнічных навук Віктар Камісараў, якому давялося быць на выставе гідам:

— Я заўважыў, што вядомы замежны спецыяліст па зубчатых колах двойчы наведваў наш павільён, не прасіў ніякай інфармацыі, а ўсё назіраў. На трэці ж раз сказаў, што яго цікавіць вельмі сур'ёзная праблема выпрабавання зубчатых колаў і матэрыялаў для іх у такіх умовах, каб вынікі лабараторных выпрабаванняў узгадняліся з данымі аб іх эксплуатацыйнай надзейнасці. Ён вывучыў каўленаму госцю беларускі стандарт на метады выпрабавання матэрыялаў для зубчатых колаў.

Хачу расказаць пра яшчэ адзін факт. Мы прывезлі на выставу кнігу «Сюрпрызы трыбафатыкі», якая была выдадзена на англійскай мове. І вось уявіце сабе: стаіць стол, і на ім вучоныя з розных краін расклалі свой тавар — манаграфіі, праспекты, паведамленні пра канферэнцыі і г.д., і цэлы шэраг вядомых у свеце метадаў, але так і не знайшоў падыходзячага.

Я падвёў яго да нашай машыны СІ-03М і замацаваў на ёй нашу лабараторную мадэль зубчатых зачапленняў, якая адэкватная натуры (у нас на гэта маецца два патэнты і адзін дзяржаўны стандарт Беларусі). Будучы сапраўды высакакласным спецыялістам, замежнік з першага погляду зразумеў наш метад, і...

— Магчыма, настрой яго сапсаваўся з-за таго, што «нейкія беларусы», пра якіх мала хто ведае ў свеце, далі фору іншым, у тым ліку і яму?

— Можа, і так. Дарэчы, дзе знаходзіцца Беларусь — звычайнае пытанне ад вучоных і спецыялістаў шмат якіх краін. Мы падарылі нашаму заціка навуковых даследаванняў, стаяць на сваім: дрэнна, няправільна, лухта. А чаму так — не скажуць аргументавана. Дарэчы, за мяжой, па маіх звестках, такіх няма, а ў Беларусі я ведаю толькі трох.

— Мяркуем, што пасля тых практычных спраў, якія ажыццёўлены ў розных галінах вытворчасці, правядзення шэрагу самых сур'ёзных даследаванняў прыхільнікамі трыбафатыкі, катэгорыя непрымірымых апазіцыянераў усё ж- такі ператварылася ў катэгорыю простых апазіцыянераў, апанентаў?

— Яны таму і непрымірымыя, што непрымірымыя...

АДУКАЦЫЯ

— Давайце, Леанід Адамавіч, паразважаем пра наступнае. Вось рэальнае жыццё: з аднаго боку — новыя вынікі ў навуцы і прызнанне, а з другога — апазіцыя, у тым ліку і непрымірымая. А ў выніку барацьбы гэтых супрацьлегласцяў пракладваецца шлях угору: трыбафатыка як новая галіна ведаў. Ці маглі б вы гэтую агульную думку праілюстраваць прадметна?

— Паспрабую. У тэхнічных навуках рэальнае прызнанне дасягненняў — гэта, вядома ж, укараненне іх у вытворчасць, бо размова тут ідзе пра матэрыяльную карысць. Але калі новыя навуковыя ідэі і вынікі становяцца прадметам для вывучэння ва ўніверсітэтах — гэта ўжо найвышэйшае прызнанне іх значнасці, бо яны з'яўляюцца новымі ведамі ў тэхнічнай сферы грамадства.

Калі шмат гадоў таму дэкан механічнага факультэта Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту прафесар Веньямін Іванавіч Сянько прапанаваў (вельмі нечакана для многіх) увесці асобны курс «Асновы трыбафатыкі» ў вучэбныя планы інстытута для падрыхтоўкі будучых інжынераў-механікаў, што тут пачалося! Барацьба думак, сумненняў, пазіцый, амбіцый была нежартоўнай — жорсткай. Але прафесар Сянько выстаяў — двойчы ішоў у «наступ», так бы мовіць. Спачатку на Савеце факультэта, а затым і на вучоным савеце інстытута (пазней ён быў ператвораны ва ўніверсітэт — БелДУТ і прафесар В.І. Сянько стаў яго рэктарам). А сёння курс па трыбафатыцы чытаецца ў пяці ўніверсітэтах краіны, у тым ліку і ў першым з іх — БДУ, гэта была ініцыятыва першага прарэктара гэтай ВНУ д.ф.-м.н. М.А. Жураўкова. І зараз створаны поўны камплект вучэбна-метадычнай літаратуры, у тым ліку 2-томны вучэбны дапаможнік, зацверджаны Міністэрствам адукацыі РБ.

— Вы сказалі: у пяці ВНУ. Але іх у нас у краіне больш за дзясятак...

— Гэта так. Але працэс пайшоў. І калі ў некаторых універсітэтах пакуль яшчэ не зусім усвядомілі... бадай што, не буду працягваць, скажу толькі наступнае: гэта не праблема трыбафатыкі, гэта іх праблема... і праблема сучасных ведаў іх студэнтаў.

МІЖНАРОДНЫЯ СІМПОЗІУМЫ

— Нам, Леанід Адамавіч, здаецца, што нялішне будзе сказаць пра тое, што прайшло ўжо, пачынаючы з 1993 года, пяць міжнародных сімпозіумаў па трыбафатыцы ў Гомелі, Маскве, Пекіне, Цярнопалі і Іркуцку, і што ў гэтай галіне атрыманы фундаментальныя вынікі, якія там абмяркоўваліся. А што будзе на сімпозіуме ў Мінску?

— Абмеркаванне новых ідэй спецыялістамі, якія з'явяцца стымулам для далейшага развіцця даследаванняў па трыбафатыцы і арганізацыі міжнароднага супрацоўніцтва ў гэтай перспектыўнай галіне, якая мае вялікае практычнае значэнне.

— Нам вядома таксама, што на сімпозіуме ў Мінску вы будзеце чытаць спецыяльную лекцыю, прысвечаную развіццю даследаванняў у новай галіне ведаў — трыбафатыцы, што некаторыя вучоныя на ім будуць узнагароджаныя: Ганаровым дыпломам «За ўклад у развіццё трыбафатыкі» і ганаровым юбілейным знакам «Трыбафатыка-25». А што гэта за ўзнагароды?

— Ганаровым дыпломам на сёння ўзнагароджана 120 вучоных розных краін. У тым ліку 16 з Беларусі. Традыцыю ўзнагароджанняў мы пачалі з 1996 г., калі ў Маскве праходзіў II Міжнародны сімпозіум па трыбафатыцы. Сёлетні сімпозіум у Мінску — юбілейны, і мы плануем узнагародзіць 25 вучоных спецыяльным юбілейным ганаровым знакам (ён выкананы ў метале), як прызнанне асаблівых заслуг перад трыбафатыкай. І, вядома, прадоўжым традыцыю ўручэння Ганаровых дыпломаў.

У КІЁТА ЗДЗІЎЛЯЛІСЯ...

— Леанід Адамавіч, раскажыце, што адбывалася ў гэтым японскім горадзе?.

— Летась вытворчае аб'яднанне «Гомсельмаш», з якім мы плённа супрацоўнічаем, і ТАА «НВА «ТРЫБАФАТЫКА» ажыццявілі сумесны праект «Сюрпрызы трыбафатыкі» для IV Сусветнага кангрэса па трыбалогіі, які праходзіў у кастрычніку ў Японіі. Пра ўзровень яго сведчаць наступныя факты. Кангрэс адкрыў спадчынны прынц гэтай краіны. На форуме было прадстаўлена каля тысячы дакладаў больш за дзве тысячы аўтараў; адначасова працавала некалькі навуковых сесій і спецыяльная выстава «Будучыня трыбалогіі».

Даючы наказ нашай групе з шасці чалавек, генеральны дырэктар «Гомсельмаша» Валерый Жмайлік падкрэсліў, каб мы памяталі, што прадстаўляем там не толькі ўказаныя прадпрыемствы, а і навуку і тэхналогіі Рэспублікі Беларусь, што па тых работах, якія мы прадэманструем, сусветная навуковая супольнасць будзе ацэньваць узровень і вартасць нашай інавацыйнага выпрабавальнага абсталявання — машын серыі СІ. Буйнейшыя замежныя фірмы, якія спецыялізуюцца на пастаўках выпрабавальнай тэхнікі сусветных вытворцаў, прапанавалі свае паслугі нам па прасоўванні нашых машын на рынак.

Асаблівую цікавасць у іх выклікалі наступныя экспанаты: зубчатыя колы дыяметрам каля 0,5 метра для бартавога рэдуктара ўніверсальнага энергетычнага сродку (УЭС-250) вытворчасці «Гомсельмаша» і адрэзак цяжкай чыгуначнай рэйкі Р-65. Па той прычыне, што яны былі зробленыя... з высокатрывалага чыгуну.

— З чыгуну?!

— Менавіта так. Спецыялістам добра вядома, што чыгун не можа супернічаць са сталлю, калі размова ідзе пра адказныя цяжканагружаныя дэталі і вузлы, бо супраціўленне стомленасці пры згібе і зносастойкасці пры трэнні качэння ў яго прынамсі на 30—40 працэнтаў ніжэй. Але нашы спецыялісты на выставе ў Кіёта ўнеслі важную папраўку: чыгун можа супернічаць са сталлю! Вось ён, створаны вучонымі і практыкамі таварыства з абмежаванай адказнасцю «НВА «ТРЫБАФАТЫКА» і вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш». І гэта не галаслоўная заява. Нашы вучоныя-гіды расказвалі зацікаўленым, што было зроблена 35 плавак чыгуну (у тым ліку 10 паўпрамысловых, і атрыманы чыгун, які па сваіх якасцях амаль не саступае найбольш трывалым маркам сталі.

У гутарку ўступае малады вучоны, кандыдат тэхнічных навук Віктар Камісараў, якому давялося быць на выставе гідам:

— Я заўважыў, што вядомы замежны спецыяліст па зубчатых колах двойчы наведваў наш павільён, не прасіў ніякай інфармацыі, а ўсё назіраў. На трэці ж раз сказаў, што яго цікавіць вельмі сур'ёзная праблема выпрабавання зубчатых колаў і матэрыялаў для іх у такіх умовах, каб вынікі лабараторных выпрабаванняў узгадняліся з данымі аб іх эксплуатацыйнай надзейнасці. Ён вывучыў каўленаму госцю беларускі стандарт на метады выпрабавання матэрыялаў для зубчатых колаў.

Хачу расказаць пра яшчэ адзін факт. Мы прывезлі на выставу кнігу «Сюрпрызы трыбафатыкі», якая была выдадзена на англійскай мове. І вось уявіце сабе: стаіць стол, і на ім вучоныя з розных краін расклалі свой тавар — манаграфіі, праспекты, паведамленні пра канферэнцыі і г.д., і цэлы шэраг вядомых у свеце метадаў, але так і не знайшоў падыходзячага.

Я падвёў яго да нашай машыны СІ-03М і замацаваў на ёй нашу лабараторную мадэль зубчатых зачапленняў, якая адэкватная натуры (у нас на гэта маецца два патэнты і адзін дзяржаўны стандарт Беларусі). Будучы сапраўды высакакласным спецыялістам, замежнік з першага погляду зразумеў наш метад, і...

— Магчыма, настрой яго сапсаваўся з-за таго, што «нейкія беларусы», пра якіх мала хто ведае ў свеце, далі фору іншым, у тым ліку і яму?

— Можа, і так. Дарэчы, дзе знаходзіцца Беларусь — звычайнае пытанне ад вучоных і спецыялістаў шмат якіх краін. Мы падарылі нашаму заціка

Група спецыялістаў па трыбафатыцы (злева направа): кандыдаты навук Віктар КАМІСАРАЎ (БелДУТ), Сяргей ЦЮРЫН (РУП «Гомсельмаш»), Сяргей ШЧАРБАКОЎ (БДУ), доктар тэхнічных навук прафесар Леанід САСНОЎСКІ (Міжведамасная лабараторыя «Трыбафатыка» і Уладзімір ЗАМЯТНІН (РУП «Гомсельмаш») каля створанай універсальнай машыны СІ-03М для зносастамляльных выпрабаванняў.

Вядомыя буйныя вучоныя (злева направа): Анатоль КУХАРАЎ, Пётр ВІЦЯЗЬ, Канстанцін ФРАЛОЎ, былы Надзвычайны і Паўнамоцны пасол КНР у Беларусі У СЯОЦЮ, Леанід САСНОЎСКІ, Міхаіл ВЫСОЦКІ, Валерый КАРАШКОЎ і дарадца Пасольства КНР па навуцы абмяркоўваюць пытанні падрыхтоўкі III Міжнароднага сімпозіума па трыбафатыцы ў Пекіне (2000).

Вучоныя і спецыялісты (злева направа): Віктар АНДРЫЯШЫН (Мінск), Аляксандр БАГДАНОВІЧ (Гродна), Валерый БОЕЎ (Гомель), Леанід САСНОЎСКІ (Гомель), Аляксандр АБДУРАШЫТАЎ (Масква), Уладзімір ЗАМЯТНІН (Гомель) і Віктар МАТВЯЦОЎ (Гомель) у лабараторыі зносастамляльных выпрабаванняў РУП «Гомсельмаш».

Натурны адрэзак чыгуначнай рэйкі і камплект зубчатых колаў для бартавога рэдуктара ўніверсальнага энергетычнага сродку УЭС-250 выраблены са спецыяльнага высокатрывалага чыгуну, што здзівіла вучоных і спецыялістаў на Міжнароднай выстаўцы IV Сусветнага кангрэсу па трыбалогіі ў японскім горадзе Кіёта (2009).

— Сюрпрызы трыбафатыкі — гэта тое, што «да яе» вучоныя і спецыялісты не маглі зразумець, растлумачыць ці аналітычна апісаць. Сфармулявана іх ужо дзевяць, і яны, несумненна, з'яўляюцца высокімі інавацыйнымі дасягненнямі ў навуцы. Вось адзін з іх — з'ява тропі: утварэння нерэгулярных рэшткавых хваляпадобных пашкоджанняў у выніку нестацыянарнага працэсу пругкапластычнага дэфармавання ў зоне кантактнага ўзаемадзеяння пры трэнні качэння. Гэта навуковая назва з'явы, і мы слова «тропі» ўпершыню ўжылі, калі падавалі свой даклад на міжнародны кангрэс у ЗША. Зараз яно гучыць і на англійскай мове як тэрмін, прыняты навуковай супольнасцю. Тропі як з'яву да нас ніхто не мог узнавіць у лабараторных умовах і растлумачыць, што да чаго. Мы ж зрабілі гэта і апісалі яе аналітычна, з ураўненнямі і г. д. Але самае галоўнае — гэта практыка. Аказалася — такая «хвароба» (нерэгулярныя хвалепадобныя пашкоджанні) негатыўна паўплывала на даўгавечнасць цяжкіх рэек чыгунак і такіх краін як Расія, Аўстралія, ЗША і г.д. І тут трыбафатыка аказалася практычна вельмі карыснай. Я думаю, што сюрпрызы трыбафатыкі — гэта сплаў інавацый для навукі, адукацыі і тэхналогій.

Пералік сюрпрызаў трыбафатыкі можна працягваць: трыбафатычная бомба, трыбафатычная трыяда, трыбафатычная энтрапія, механатэрмадынаміка... Яны абмяркоўваліся шырока на многіх навуковых форумах, і нядзіўна, што наша кніга «Сюрпрызы трыбафатыкі» выклікала такую вялікую цікавасць і на міжнародным кангрэсе ў Кіёта. Вось чаму, мы думаем, што година прадставілі на гэтым высокім форуме не толькі нашы прадпрыемствы, але і нашу навуковую дзяржаву, бо краіна, якая ў наш час можа стварыць новую навуку, гэта, на маю думку, — навуковая дзяржава.

— Дарэчы, Леанід Адамавіч, з «Гомсельмашам» у вас самыя цесныя сувязі, там практычна ўвасабляюцца ідэі трыбафатыкі...

— Правільна. Там дзейнічаюць лабараторыя зносастомленасных выпрабаванняў, якой кіруе У.А. Замятнін, і міжведамасная лабараторыя «ТРЫБАФАТЫКА», дзе вырашаюцца праблемы, звязаныя з найважнейшымі дзяржаўнымі задачамі.

— Як расказваў нам у свой час галоўны інжынер РУП «Гомельтранснафта «Дружба» Аляксандр Бардоўскі, кожны год на розных участках нафтаправода адбывалася ад адной да трох аварый. І калі кіраўнікі прадпрыемства звярнуліся да вас і ў выніку былі ажыццёўленыя сумесна распрацаваныя мерапрыемствы, аварыі зніклі. Што адбылося, Леанід Адамавіч?

— Новая навука сказала сваё слова, паказала ўзровень сваіх магчымасцяў. Яна ўстанавіла галоўныя прычыны аварый. І тады вельмі высокакваліфікаваны калектыў «Гомельтранснафты «Дружба» здолеў спыніць тыя разбурэнні труб. Ды не на адзін-два гады, а больш чым на 9 гадоў. Аляксандр Міхайлавіч нарэшце стаў спаць спакойна. Дарэчы, да таго ж зберагліся больш за 2,5 мільёна долараў ЗША. Можна сказаць, новыя тэхналогіі прадаўжэння тэрміну службы лінейных участкаў нафтаправода аказаліся высокаэфектыўнымі.

— Хочам яшчэ раз звярнуцца да слова «трыбафатыка». Гэта што — арыгінальны тэрмін?

— Так. І мы ганарымся, што некалькі «прыдуманых» намі тэрмінаў прыняты супольнасцю вучоных і прыжыліся ў англійскай мове. Але асаблівы наш гонар — стварэнне тэрміналогіі па трыбафатыцы і на роднай беларускай мове.

Зацверджаны дзяржаўны стандарт «Трыбафатыка. Тэрміны і вызначэнні» і выдадзены чатырохмоўны тэрміналагічны слоўнік па трыбафатыцы. Павінен сказаць асобнае слова ўдзячнасці акадэміку Аляксандру Іванавічу Падлужнаму: без яго велізарнай асабістай працы сістэма беларускіх тэрмінаў не адбылася б у такой высокакваліфікаванай пастаноўцы. Сістэма гэта ўключае больш за 400 (!) тэрмінаў.

— Леанід Адамавіч, вы з'яўляецеся аўтарам двух паэтычных кніжак, ганаровым грамадзянінам горада Чачэрска. Адкуль бераце вольны час для паэтычнай творчасці?

— Здараецца, што душа просіць выказацца паэтычна. Не адмаўляю ёй тады. Дарэчы, са сваім земляком, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхасём Болсунам (яго ідэя была) мы выдалі зборнік вершаў вядомых і пачынаючых паэтаў Чачэршчыны. Гэта прынесла вялікае задавальненне і нам, аўтарам, і чытачам.

— Ведаем, што іншым разам наведваецеся ў вёску Палессе, дзе нарадзіліся... Сустракаецеся з вучнямі, дапамагаеце школе кнігамі ў бібліятэку, матэрыяламі для рамонту па магчымасці... Шырокае поле дзейнасці ў Вас. Ці можна, Леанід Адамавіч, лічыць, што дэвіз вашага жыцця — «тапчы дарожку»?

— Няхай будзе так (усміхаецца). Але я дапоўніў бы: таптаць дарожку лёгка — цяжка яе пракладваць. А каб пракладваць — патрэбна праца, праца, праца! Цяжкая праца! У любых умовах. І многія-многія гады, якія складваюцца ў дзесяцігоддзі. Дык вось, трыбафатыцы сёння — 25, мне — 75. Падлічым разам — усе 100!

І юбіляр, і мы разам з ім смяёмся. Дружна, весела і шчыра. На што маем поўнае права...

ТРЫБАФАТЫКА: НЕКАТОРЫЯ ВЫНІКІ

- Апублікавана больш за 500 работ, у тым ліку 20 кніг і манаграфій.
- Распрацавана 7 дзяржаўных стандартаў, у тым ліку 3 — міждзяржаўныя.
- Атрымана 18 патэнтаў.
- За апошнія 10 гадоў абаронена 8 кандыдацкіх і адна доктарская дысертацыі.
- Праведзена 5 міжнародных сімпозіумаў па трыбафатыцы ў чатырох краінах (Гомель, Масква, Пекін, Цярнопаль, Іркуцк).
- 120 вучоных розных краін узнагароджаны Ганаровым дыпломам «За ўклад у развіццё трыбафатыкі».
- З 1996 года працуе Міжнародны каардынацыйны Савет па трыбафатыцы, зацверджаны Акадэміямі навук Беларусі, Расіі і Украіны.
- У 2004 годзе Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях РБ, Нацыянальная Акадэмія навук Беларусі, Міністэрства прамысловасці і Міністэрства адукацыі падпісалі Пратакол аб стварэнні Міжведамаснай лабараторыі «Трыбафатыка».
- Створаны новы клас выпрабавальнага абсталявання — машыны серыі СІ для комплексных зносастамляльных выпрабаванняў матэрыялаў і мадэляў сілавых сістэм. Ужо распрацавана і выраблена 11 мадыфікацый такіх машын. У апошнія гады 5 з іх (чатыры для ВА «Гомсельмаш» і адна — для РУП «Гомельтранснафта «Дружба»).
- Навучальны курс па трыбафатыцы ўведзены ў пяці ВНУ краіны. Ён чытаецца для будучых інжынераў і матэматыкаў-механікаў. Створана поўнае вучэбна-метадычнае забеспячэнне гэтага курса.
- Выдадзена 5 вучэбных дапаможнікаў для тэхнічных універсітэтаў, у тым ліку 2-томны лекцыйны курс па трыбафатыцы, зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.
- Сумесна з ВА «Гомсельмаш» атрыманы спецыяльны высокатрывалы чыгун з шарападобным графітам, які валодае асаблівымі ўласцівасцямі: яго службовыя характарыстыкі (супраціўленне выгібной і кантактнай стомленасці) параўнальныя з такімі характарыстыкамі для высокатрывалых сталей. З гэтага чыгуну выраблены вопытныя партыі буйнагабарытных зубчатых колаў бартавога рэдуктара энергетычнага сродку УЭС-250 і нажоў для рэжучага барабана камбайна КВК8060. Эксплуатацыйныя выпрабаванні пацвердзілі іх працаздольнасць.
- РУП «Гомельтранснафта Дружба», выкарыстоўваючы вынікі навуковых даследаванняў па трыбафатыцы, распрацавала і ўкараніла метады і тэхналогіі падтрымання і частковага аднаўлення трываласнай надзейнасці лінейных участкаў нафтаправоду «Дружба», што дало рэальны эканамічны эфект звыш 2,5 млн долараў ЗША.

ТАА «НВА ТРЫБАФАТЫКА»
246013, г. Гомель, вул. Арудзійная, 15А.
Тэл.: 8 0232 77 44 55, 74 59 76.
УНП 400022030

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению ЧУП «Минская межрайбаза ОПС» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже единым лотом объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: **Минский район, Острошицко-Городокский с/с, д. Острошицкий Городок** в составе: административное здание (инв. № 600/С-57590), об. пл. 153,1 кв.м (пер. Трудовой, д. 1); здание магазина «Хлеб» (инв. № 600/С-125625), об. пл. 55,4 кв.м; здание магазина № 50 (инв. № 600/С-65564), об. пл. 201,8 кв.м; склад-сарай (инв. № 600/С-125585), об. пл. 61,7 кв.м.

Начальная цена с НДС – 139 670 547 бел. руб.

Площадь земельного участка – **0,3282 га.**

Задаток в сумме 13 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 15 (пятнадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, **если иное не предусмотрено договором купли-продажи.**

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **29.09.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 28.09.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Зенит-БелОМО» (продавец) проводит очередной открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: **Минская область, Вилейский район, Нарочанский с/с, д Принта, в составе:**

Лот № 1: склад хранения семян, об. пл. 495,6 кв.м. Начальная цена с НДС – 8 656 161 бел. руб. Земельный участок пл. 0,6985 га.

Лот № 2: склад зернофуража, об. пл. 442,5 кв.м. Начальная цена с НДС – 36 785 441 бел. руб. Цены снижены на 50 %. Земельный участок пл. 0,1245 га. Задаток 10 % от начальной цены.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 18.05.2010.

Аукцион состоится **07.09.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.09.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

У КРЫМЕ КРАКАДЗІЛ АДКУСІЎ ПАЛЕЦ ХЛОПЧЫКУ З БРЭСТА

Няшчасны выпадак адбыўся на тэрыторыі тэатра марскіх жывёл «Акваторыя» 25 жніўня, паведамляе прэс-служба МНС Крыма.

Кракадзіл укусіў трохгадовага хлопчыка за руку. У выніку дзіця было дастаўлена ў аддзяленне дзіцячай хірургіі Ялцінскай гарадской бальніцы з апутацыяй 4-га пальца левай кісці на ўзроўні асноўнай фалангі, няпоўным абрывам 3-га пальца левай кісці, пераломам 1-й, 2-й і 3-й пясцевых костак і ўкушанымі ранамі. Хлопчыку была аказаная медыцынская дапамога.

Паведамляецца, што дзіця адпачывала з бацькамі на базе адпачынку «Сатэра» ў Алушце.

Алена КРАВЕЦ.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЖИЛЫХ ДОМОВ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ:

НАИМЕНОВАНИЕ, МЕСТОПОЛОЖЕНИЕ, ЦЕЛЕВОЕ НАЗНАЧЕНИЕ ОБЪЕКТОВ

• Здание одноквартирного жилого дома № 7, общая площадь 99,2 м² (инвентарный № 633/С-9689) с земельным участком площадью 0,2498 га (кадастровый номер 624077410601000027), расположенного по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Свирский с/с, д. Лущики, с начальной ценой 2 380 000 рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и его государственной регистрацией, подлежат возмещению победителем аукциона в сумме 2 376 791 рубль. Шаг аукциона установлен в размере 10 % от предыдущей цены. **УЧАСТОК РАСПОЛОЖЕН В ПРИБРЕЖНОЙ ПОЛОСЕ ОЗЕРА СВИРЬ.**

ПРОДАВЕЦ — Свирский поселковый исполнительный комитет.

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА — СИКУП «УКС-СЕРВИС».

СУММА ЗАДАТКА — 10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, получатель платежа: СИКУП «УКС-СЕРВИС».

ФОРМА, УСЛОВИЯ ОПЛАТЫ — платеж в размере цены приобретения объекта за вычетом суммы задатка на р/с № 3600623111904 в ЦБУ № 619 филиала № 632 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Вилейка, код 260, получатель платежа: ГУ Минфина РБ Свирский поселковый исполком; код платежа 04805 УНН 600097436, ОКПО 04430832, согласно протоколу аукциона, в течение 20-ти рабочих дней со дня получения протокола аукциона. Возмещение расходов, связанных с формированием объектов и их государственной регистрацией перечислять также на указанный счет с кодом платежа 04616.

• Здание жилого дома № 47 (доля в праве 1/2), общая площадь 95,7 м² (инвентарный № 633/С-6779) с земельным участком площадью 0,0621 га (кадастровый номер 624057400001000342), расположенного по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Свирский с/с, г.п. Свирь, ул. Советская, с начальной ценой 2 090 000 рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и его государственной регистрацией, подлежат возмещению победителем аукциона в сумме 2 234 925 рублей. Шаг аукциона установлен в размере 10 % от предыдущей цены. **УЧАСТОК РАСПОЛОЖЕН В ПРИБРЕЖНОЙ ПОЛОСЕ ОЗЕРА СВИРЬ.**

ПРОДАВЕЦ — Свирский поселковый исполнительный комитет.

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА — СИКУП «УКС-СЕРВИС».

СУММА ЗАДАТКА — 10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, получатель платежа: СИКУП «УКС-СЕРВИС».

ФОРМА, УСЛОВИЯ ОПЛАТЫ — платеж в размере цены приобретения объекта за вычетом суммы задатка на р/с № 3600623111904 в ЦБУ № 619 филиала № 632 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Вилейка, код 260, получатель платежа: ГУ Минфина РБ Свирский поселковый исполком; код платежа 04805 УНН 600097436, ОКПО 04430832, согласно протоколу аукциона, в течение 20-ти рабочих дней со дня получения протокола аукциона. Возмещение расходов, связанных с формированием объектов и их государственной регистрацией, перечислять также на указанный счет с кодом платежа 04616.

СУММА КОМПЕНСАЦИИ ЗАТРАТ НА ОРГАНИЗАЦИЮ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНА: согласно протоколу аукциона, в течение 5-ти рабочих дней на р/счет СИКУП «УКС-СЕРВИС».

Документы, предоставляемые для участия в аукционе: заявление на участие, заверенная банком копия платежного документа на внесение задатка, физическим лицам — паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, юридическим лицам — копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, заверенные нотариально, доверенность, выданная представителю юридического лица.

КОНЕЧНЫЙ СРОК ПРИЕМА ЗАЯВЛЕНИЙ — 23.09.2010 г. до 16.00.

АДРЕС, ПО КОТОРОМУ ПРИНИМАЮТСЯ ЗАЯВЛЕНИЯ: г. Молодечно, ул. Мира, д. 15, к. 1.

ДАТА, ВРЕМЯ, МЕСТО И ПОРЯДОК ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА — 30.09.2010 года в 14.00 по адресу: г.п. Свирь, ул. Гуриновича, д. 29, Свирский исполком.

Аукцион состоится при наличии не менее двух участников на один лот.

Блізкая ўлада

НА САМЫМ ПРАБЛЕМНЫМ ПРАДПРЫЕМСТВЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Абсалютную большасць з 22 наведвальнікаў прыёму хвалююць праблемы крэдытаў, субсідый — усё, што звязана з будаўніцтвам жылля. Многія падчас гутаркі атрымалі адпаведныя кансультацыі па прымяненні заканадаўства. Адна з работніц камбіната як за апошнюю надзею схапілася за магчымасць сустрэчы з упаўнаважаным прадстаўніком Прэзідэнта. У іх з мужам невялікая зарплата, яны маюць права на субсідыю... Але субсідыі атрымліваюць у горадзе тыя, хто стаіць у чарзе з 1991 года. Гэтая сям'я ўключана ў спісы на паляпшэнне жыллёвых умоў у 1993 годзе. Рэч у тым, што субсідыі выплочваюцца ў залежнасці ад наяўнасці грошай у бюджэце на гэтыя мэты. Старшыня Брэсцкага гарвыканкама выказаўся пра гэта так: «Мы крыўдзім людзей. Трэба прымаць нейкія меры на дзяржаўным узроўні». Пётр Пракаповіч прапанаваў старшыні гарвыканкама тэрмінова накіраваць адпаведную запіску ў Саўмін. А наведвальніца потым сказала ў калідоры: «Не ведаю, як жыць далей, у нас усе спадзяванні былі на гэтую субсідыю».

Раіса Паўлаўна, таксама працаўніца камбіната, часткова па сваёй віне трапіла ў вельмі складаную сітуацыю з кватэрным пытаннем. Яна не раз была ў гарвыканкаме, адміністрацыі свайго раёна. І справа выходзіла так, што ёй літаральна днямі збіраліся пералічыць кошт жылля з тым, каб сям'я жанчыны ўнесла дадаткова даволі вялікую суму. Але ўважліва азнаёміўшыся з дакументамі, Пётр Пракаповіч указаў мясцовым чыноўнікам, што ў выпадку якіх-небудзь розначытанняў ці супярэчнасцяў у заканадаўстве, яны тлумачацца на карысць грамадзяніна. І такая «закавыка» была знойдзеная. Тут жа спецыялісты гарвыканкама разам з мэрам далі парады наконт неабходных дакументаў і працэдур, каб вырашыць пытанне Раісы Паўлаўны станоўча. І маці траіх дзяцей пайшла з прыёму з аптымістычным настроем.

На прыёме ўзнікалі пытанні па добраўпарадкаванні вуліц, рабоце гарадскога транспарту, сезонных паводках на дачных участках, — але гэта ўсё пытанні, так бы мовіць, рабочага парадку, якія ў горадзе паступова вырашаюцца. На маю думку, вельмі знакавым быў зварот самай першай наведвальніцы прыёму. Тамара Іванаўна мае дваіх дзяцей школьнага ўзросту, 49-гадовы муж — інвалід першай групы, шэсць гадоў не паднімаецца з ложка. Яе сціплая просьба датычыла памяншэння платы за камунальныя паслугі, а яшчэ бясплатных лекаў для мужа. На жаль, давялося канстатаваць, што льготы па камунальных плацяжах ёй не прадугледжаныя. Такі закон. Калі ж папрасілі патлумачыць кіраўніка гарадской медыцыны наконт лекаў, то ён сказаў, што рэцэпты на бясплатнае іх атрыманне могуць быць выпісаныя, для гэтага патрэбны толькі кансіліум урачоў. Чалавек ляжыць з 2006 года, чаму да гэтай пары не быў праведзены той кансіліум? — проста лезла на паверхню пытанне.

«Нашы людзі вельмі сціплыя», — заўважыў між іншым Пётр Пракаповіч. Гэта можна было сказаць, гледзячы на Тамару Іванаўну. Яна не расказвала прысутным, як цяжка ёй жывецца, як складана сабраць дзяцей у школу. Гэта прабілася само сабой толькі раз, калі пасля першых яе пытанняў гутарка зайшла пра транспартнае забеспячэнне раёна. Нехта з прысутных заўважыў: не бяда, што з перасадкамі дабірацца на работу, можна браць адзіны праязны білет. А яна не стала тлумачыць, што розніца паміж коштам праязнога на адзін від транспарту і так званы адзіны, для яе значная.

Цалкам відавочна, што ў дачыненні да такіх сем'яў трэба нешта рабіць на дзяржаўным узроўні. Нават калі для гэтага давядзецца ўціснуцца па якіх-небудзь іншых праграмах.

Варта спыніцца на гісторыі яшчэ адной наведвальніцы, бо такія звароты бываюць на кожным прыёме, кожнай «прамой лініі». 52-гадовая брастаўчанка літаральна патрабавала даць ёй дзяржаўнае жыллё на час будаўніцтва кааператыўнага. Жанчына і яе муж — ваенныя пенсіянеры, у іх расце 9-гадовая дачка. «Я служыла радзіме, а маё дзіця — бомж», — рэфрэнам паўтарала заяўніца. Для ўсіх службаў гарвыканкама яна чалавек знаёмы, ёй паўтаралі каторы раз, што яе сям'я ўключана ў спісы ЖБК. Але жанчына нікога не слухала і паўтарала, што яе дзіця — бомж, і гэта ганьба для ўсіх. Яна абмовілася, што дзесяць гадоў на пенсіі, за кватэру гаспадыні кожны месяц аддае мільён. І тут, калі адкінуць рыторыку, паўстаюць пытанні. Многія сумленныя працаўнікі ў яе ўзросце не маюць пенсіі, таксама не атрымлівалі ніколі дзяржаўнага жылля і нейкім чынам паляпшаюць умовы пражывання сябе і сваіх дзяцей. І яшчэ, відаць, добрыя апартаменты здымае спадарыня, калі плаціць за іх мільён у месяц. Сёння ў Брэсце за 200 долараў без праблем можна зняць аднапакаёвую кватэру, нават з часовай рэгістрацыяй, і тады адпадзе патрэба рабіць фішку з таго, што тваё дзіця — бомж.

* * *

Пасля прыёму Пётр Пракаповіч сказаў журналістам, што ў цэлым ён станоўча ацэньвае работу са зваротамі грамадзян брэсцкіх чыноўнікаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Абзац

◢ У Беларусі будзе пабудаваны новы (пяты) цукровы завод. У яго будаўніцтве выказваюць зацікаўленасць Магілёўская і Гомельская вобласці, таму ў якасці месца будаўніцтва завода разглядаецца пляцоўка на мяжы гэтых абласцей, у раёне Бабруйска.

◢ **У Беларусі асобы без пастаяннага месца жыхарства з 17 верасня будуць рэгістравацца ў пунктах сацыяльнай адаптацыі і рэсацыялізацыі або ў іншых месцах, якія вызначаць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Такі парадак рэгістрацыі па месцы знаходжання прадугледжаны адпаведнай пастановай Саўміна.**

◢ Новы будынак следчага ізалятара і рэспубліканскай турэмнай бальніцы мяркуюць пабудаваць у Беларусі да 2015 года ў Калядзічах, паведаміў учора журналістам начальнік аддзела па наглядзе за выкананнем крымінальнага пакарання Генпракуратуры краіны Юрый Гарошка. Прыняцце такога рашэння абумоўлена тым, што зараз следчы ізалятар №1 знаходзіцца ў будынку былога Пішчалаўскага замка, вежа якога некалькі гадоў таму абрынулася.

◢ **Беларусь зацікаўленая ўвайсці ў расійскую праграму куплі легкавых аўтамабіляў у абмен на старыя, паведаміў журналістам намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Анатоль Ліс. У Расіі цяпер грамадзяне, якія жадаюць набыць новы аўтамабіль айчыннай вытворчасці, могуць здаць сваю старую машыну, каб набыць танней новую. Па словах А. Ліса, Мінпрыроды Беларусі выйшла з ініцыятывай ва ўрад Саюзнай дзяржавы ды ключэнні Беларусі ў гэтую праграму і назначэнні крыніцаў фінансавання саюзнага бюджэту.**

◢ У Мінску на пешаходным пераходзе легкавая аўтамашына збіла дзвюх школьніц. ДТЗ адбылося 25 жніўня ўдзень. Жанчына 1981 года нараджэння на аўтамашыне «Пежо 406» учыніла наезд на дзвюх школьніц, якія пераходзілі дарогу па рэгуляваным пешаходным пераходзе на зялёны сігнал святлафора. Абедзве дзяўчынкі шпіталізаваныя.

◢ **Жыхарка Гродна падазраецца ў забойстве сваёй дачкі, якую знайшлі з перарэзаным горлам. Следства завяло крымінальную справу ў дачыненні да 46-гадовай жыхаркі абласнога цэнтра, якая падазраецца ў тым, што зарэзала сваю 21-гадовую дачку, студэнтку 4 курса БДУ. Маці паспрабавала скончыць жыццё самагубствам. Следства высвятляе прычыны забойства і правярае інфармацыю пра тое, што падазроная лячылася ў псіхдыспансэры.**

◢ У французскім горадзе Анмас ва ўзросце 66 гадоў памёр сусветна вядомы дыетолаг Мішэль Мантыньяк. Ён праславіўся як аўтар кніг пра пахудзенне. Самай вядомай з іх стаў яго бестселер «Я ем, а значыць, я худзею», надрукаваны ў 1987 г. Больш за 16 млн. экз. гэтай кнігі, перакладзенай на дзясяткі моў, было прададзена ва ўсім свеце. Усяго ён апублікаваў 20 кніг, большасць з якіх сталі сусветнымі бестселерамі. Менавіта Мантыньяк з'яўляецца аўтарам прынцыпу раздзельнага харчавання — размежавання прадуктаў, што ўтрымліваюць ліпіды і вугляводы, падчас аднаго прыёму ежы.

Поўны абзац

◢ **Кітаец адгадаваў доўгія пазногці, каб адвучыць сябе ад боек. 41-гадовы Вэнь Цзянь расказаў, што доўгія пазногці дапамагаюць яму перамагчы сваю агрэсію і не ўступаць у вулічныя бойкі. У маладосці ён не раз трапляў у непрыемныя сітуацыі з-за свайго крутога нораву. Адгадаваўшы пазногці, ён пазбавіў сябе магчымасці сціскаць кулакі і пускаць іх у справу. За 13 гадоў пазногці дасягнулі даўжыні 35 см. І, як адзначае Вэнь, жыццё наладзілася — ён адчыніў краму адзення для дзяцей, назва якой перакладаецца як «доўгі пазногаць». Многія наведвальнікі прыходзяць проста для таго, каб паглядзець на гаспадара, а сыходзяць з пакупкамі. Каб не зламаць пазногці падчас сну, Вэнь апускае рукі ў каробку з-пад абутку.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

В связи с процессом ликвидации УП «Ландыш» ЛИКВИДАЦИОННАЯ КОМИССИЯ ВЫСТАВЛЯЕТ НА ПУБЛИЧНЫЕ ТОРГИ ОБЪЕКТ НЕДВИЖИМОСТИ:

Лот 1. Здание цеха об. пл. 3406,5 кв. м, ограждение (кирпичное; ж/б), таль электрическая ТЭ-050, котел КСТ-25, котел КСВ-0,09Т, газовое оборудование к котлам, кабель электроснабжения 0,4 кВ, *г. Слуцк, ул. М. Богдановича, д. 57 а.* Начальная стоимость с НДС (снижена на 50 %) — 447671030 бел. руб. Задаток — 10 % от указанной стоимости. Зем. участок для обслуживания объектов будет выделен из земельного участка об. пл. 1,6491 га, находящегося в постоянном пользовании УП «Ландыш». Объекты продаются без условий. Задаток перечисляется на р/с 3012200130017 в ОАО «БелАПБ» г. Слуцк, МФО 153001921, УНП 600154422 УП «Ландыш».

Аукцион состоится 28.09.2010 г. в 12.00 по адресу: 223610, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 57 а.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 27.09.2010 г. до 16.00** по указанному адресу.

Контактный тел.: 8 01795 2 43 26, м. т. 8 029 670 96 63.

Факт

Найбольш запатрабаваныя маляры-тынкоўшчыкі

Гарадская служба занятасці аб'явіла набор беспрацоўных на бясплатныя курсы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі па трох дзясятках спецыяльнасцяў. Упершыню ў іх ліку прафесія машыніста аўтавышкі і аўтагідрапад'ёмніка. Пра гэта карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» расказала начальнік аддзела прафесійнага навучання і прафесійнай арыентацыі ўпраўлення занятасці насельніцтва Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ларыса Каткова.

Групы будуць фарміравацца на працягу верасня. Тэрмін навучання ад 2 месяцаў (аператар ПЭВМ з веданнем апрацоўкі баз даных) да 11 месяцаў (кухар-кандытар).

Найбольш запатрабаваныя на сталічным рынку працы па-ранейшаму рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў, напрыклад, маляры-тынкоўшчыкі, абліцоўшчыкі, плітачнікі, электрагазазваршчыкі, муляры, печнікі, а таксама прадаўцы і кантралёры-касіры.

Тэлефоны для даведак:
267 58 04 і **263 61 71.**
Ніна ЯНОВІЧ, «Мінск—Навіны».

ЧЫТАЧЫ «ЗВЯЗДЫ» ПРАПАНУЮЦЬ МІНІСТРУ КУЛЬТУРЫ ЗНЯЦЬ ФІЛЬМЫ ПРА ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ І ВЫБІТНЫХ БЕЛАРУСАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Анатоль Іванавіч ЖОГЛА з Лельчыцаў прапануе зняць фільм (праўда, не дакументальны, а мастацкі) па ягонай кнізе «Зоркавы кліч» (напісаная пад творчым псеўданімам Анатоль Стадалюк). Кнігу, Анатоль Іванавіч, мы міністру перадалі. Дзякуем вам за цёплыя словы на адрас нашай газеты і яе асобных аўтараў (асабліва дзякаваў карэспандэнт Яўген Валошын).

Наш чытач з вуліцы Адоеўскага ў Мінску Аляксей Андрэевіч САЛАМОНАЎ прапануе зняць фільм пра сябе. Аляксей Андрэевіч паведамляе, што ў яго падрыхтаваная да выдання «Мая справаздача грамадству аб сваёй стваральнай яшчуядзейнасці з аналізам яго мінулага і поглядам у будучыню». Аляксей Андрэевіч піша пра сябе: «Я — не маньяк з адпаведнай маніяй, а доктар вельмі тонкіх тэхнічных навук (па атамных электрастанцыях), прафесар, акадэмік адной з прэстыжных міжнародных акадэмій. У апошнія гады існавання СССР я быў у ім вядучым публіцыстам грамадска-думкавага кірунку, друкаваўся і ў Нью-Ёрку. Падрыхтаваў некалькі брашураў, вялікі зборнік вершаў». Згадвае Аляксей Андрэевіч і як быў у часе вайны ў лагеры, як стаў пасля кулямётчыкам, як застаўся інвалідам 2-й групы, як 5 гадоў узначальваў Універсітэт беларускай мовы, гісторыі і культуры і што мае больш за 200 артыкулаў.

З вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна міністру пішуць удзельнікі фальклорна-этнаграфічнага ансамбля «Міжрэчча» (К. ПАНЧЭНЯ, Ю. ПАНЧЭНЯ, Л. ЕЎДАКІМЦАВА, З. ДОЎГАДВОРАВА). Яны звяртаюць увагу міністра, што не так даўно абрад «Юр'еўскі карагод» атрымаў стутус (першы на Беларусі) нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці. І зазначаюць, што іх калектыў захоўвае цэлы шэраг рэдкіх абрадаў («Гу, вясна!», «Калядкі», «Шчодрык»...), на якія таксама трэба неадкладна звярнуць увагу — зафіксаваць у дакументальным кіно. Удзельнікі калектыву смуткуюць, што з тэлебачання зніклі праграмы кшталту «Запрашаем на вячоркі», «Радавод», «Спявай, душа!»... Просяць міністра «зноў адкрыць такую перадачу».

Старшыня мясцовай ветэранскай арганізацыі Вікенці МАРОЗ з вёскі Даманава Івацэвіцкага раёна лічыць, што варта зняць дакументальныя фільмы пра Вялікае Княства Літоўскае, яго федэрацыю з Рэччу Паспалітай, пра тры падзелы Рэчы Паспалітай і паламаныя пры гэтым лёсы людзей, пра паўстанне Касцюшкі, Каліноўскага. Вікенці Іванавіч прыгадвае, што ў іх у Івацэвіцкім раёне частка лесу называлася Шыбельная гара — тут царскія служкі павесілі 20 паўстанцаў Каліноўскага. Спадару Марозу на ўсё жыццё запомнілася, як яшчэ ў 1948-49 г. ён бачыў на кожным дрэўцы па абразку, пацёкамі смалы... Пасля гэты лес «спілавалі і спалілі на свінаферме». Вікенці Іванавіч пералічвае, пра каго з выбітных беларусаў ён ахвотна паглядзеў бы дакументальнае кіно: Дунін-Мірцінкевіч, Багушэвіч, Доўнар-Запольскі, Смоліч, Колас, Купала, Багдановіч, Міцкевіч, Танк, Брыль, Пястрак. Яшчэ адна прапанова — зняць дакладны фільм пра 17 верасня 1939 года, уз'яднанне Заходняй і Усходняй Беларусі. Пакуль яшчэ жывыя відавочцы. Іншая цікавая прапанова — зняць дакументальны фільм пра беларускую Вільню: якія мясціны сённяшняй літоўскай сталіцы павінен ведаць кожны беларус.

Некалькі прапаноў паступіла і ад **наведнікаў сайта «Звязды». Чытачка Ніна** піша, што яе вельмі ўразіў матэрыял у нашай газеце пра настаяцеля Хоцімскай царквы, які ўсё сваё жыццё паклаў на захаванне, адраджэнне, будаўніцтва найпрыгажэйшага праваслаўнага храма. Асабліва запомнілася Ніне дэталь, што святар купляў сабе «мех макароны на месяц, астатнія грошы — на храм». Чытачка перакананая, што гэта — гатовы дакументальны фільм.

Чытач пад подпісам «Неверагоднае побач» звяртае ўвагу, што ў нас ёсць выбітная кінадакументалістыка — напрыклад, стужкі Галіны Адамовіч і Віктара Аслюка. Смуткуе, што іх не паказваюць па тэлевізары.

Некалькі дзясяткаў прапаноў паступіла і на мой сайт www.labadzenka.by — яны таксама ўсе перададзеныя Паўлу Латушку. Тут — зноўку ВКЛ, таямніцы полацкай гісторыі з кніг Уладзіміра Арлова, беларуская шляхта ў постацях, гісторыі ўтварэння беларускіх гарадоў, нецэнзураваныя класікі, змаганне беларусаў з царскім рэжымам, яўрэі на Беларусі, войны ВКЛ з Маскоўскай Руссю, эміграцыя беларусаў у Паўднёвую Амерыку на пачатку XX стагоддзя, гісторыя рэлігій на Беларусі, сталінскія рэпрэсіі, гісторыя беларускага тэатра, пра Першую сусветную вайну (на падставе даследаванняў Уладзіміра Багданава). Таксама наведнікі прапануюць шмат постацяў — гатовых герояў дакументальнага кіно: Антон Луцкевіч, Янка Купала, святы Казімір, князі Радзівілы, Цішка Гартны, Еўфрасіння Полацкая, Ян Караль Хадкевіч, Максім Гарэцкі ды іншыя Гарэцкія, Уладзімір Жылка, Марк Шагал...

Мы дзякуем усім, хто адгукнуўся! Цяпер Міністэрства культуры мае колькі дзясяткаў прапаноў для дакументальнага кіно — тое, што насамрэч цікава людзям з розных куткоў Беларусі. Чакаем фільмаў!

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

Поле льняных «цудаў» — 40 мільярдаў рублёў

Губернатар Віцебскай вобласці асабіста «падняў» лён. І некаторыя старшыні райвыканкамаў на самым вялікім льняным полі ў Беларусі таксама «ўспомнілі маладосць»: як у юнацтве, папрацавалі на льняным палетку.

Кожны дзень спазнення ўборкі льнотрасты пагражае выніку — зарабіць на лёне можна ў разы больш, калі ўбраць яго аператыўна.

— На нашым Дубровенскім ільнозаводзе ўстаноўлена новая бельгійская лінія, — расказвае «Звяздзе» **старшыня Дубровенскага райвыканкама Анатоль ЛУКАШОЎ**. — Завод механізуем. Укладзены вялікія фінансавыя сродкі. Шмат у апошнія гады зрабілі, каб павысіць ураджайнасць лёну. Верагодна, у нас у раёне самае вялікае поле. Працуюць на ім добрыя працаўнікі, падабралі добрае звяно. Распрацавалі сваю тэхналогію. Ёсць неабходная спецыялізаваная тэхніка. У перспектыве плануем атрымліваць да 18 цэнтнераў валакна з гектара.

— У вобласці як ніколі нармальнае становішча з ільнаводствам. Зараз на палях каля 60 тысяч тон трасты. У прыватнасці, у Дубровенскім раёне 10 тысяч тон, — расказвае «Звяздзе» **кіраўнік беларускага «Інстытута льну» Іван ГОЛУБ**. — Калі перавесці гэта ў грошы (за 60 тысяч тон), атрымліваецца каля 40 мільярдаў рублёў. Гэтыя грошы ляжаць на полі. Іх — трэба проста падняць.

— Вось глядзіце, калі летась у нас была ўраджайнасць 1,5—2 тоны льнотрасты з гектара, то сёлета — да 6 тон даходзіць на лепшых участках, — канстатаваў прама на льняным полі **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ**, — За год літаральна выйшлі на плюсавую рэнтабельнасць.

Кожны дзень спазнення з уборкай пагражае стратай якасці. Калі, напрыклад, сабраць сёння так званы «нумар» валакна будзе 14, 16, а праляжыць яшчэ тыдзень — ужо 12... Адпаведна, меней можна будзе зарабіць на яго продажы.

Губернатар паставіў задачу ўбраць ураджай за дзесяць дзён. У ліку іншых удзел у льняным жніве прымаюць навучэнцы, студэнты... Губернатар падняў некалькі метраў лёну і «натхніў» на гэта некаторых старшыняў райвыканкамаў, якія бралі ўдзел у выязным пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама.

— А ці хопіць вам зароблены грошай, напрыклад, на добры касцюм? — запытаў на полі студэнтаў губернатар. Хлопцы з Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі прызналіся, што так. Карэспандэнт «Звязды» высветліў, што пры добрай працы можна зарабіць за мільён рублёў.

Што тычыцца эксперыменту ў Дубровенскім раёне і на Магілёўшчыне наконт вырошчвання французамі лёну, каб можна было высветліць, ці лепшыя іх гатункі ў параўнанні з беларускімі, высновы канчатковыя яшчэ не зроблены. Той жа спадар Голуб упэўнены, што беларускае насенне лёну не горшае за іншаземнае. А, у прыватнасці, дырэктар Дубровенскага льнокамбіната мае іншы погляд. Губернатар патрабаваў канкрэтна адказаць на гэтае пытанне па выніках сёлетняга жніва лёну.

На Дубровенскім ільнозаводзе па просьбе губернатара будзе паскорана мадэрнізацыя. Умовы працы вывучаць у тым ліку і медыкі. Праца тут нялёгкая. Шум, вібрацыі, дыхаць цяжка. А заробак параўнальна невялікі. Пастаўлена задача — вывучыць, якое абсталяванне лепш купляць, каб яно адпавядала самым перадавым патрабаванням, і не зацягваць з мадэрнізацыяй прадпрыемства, паралельна засвойваючы выраб новай прадукцыі. Чаму б, напрыклад, не вырабляць з лёну алей? Гэты экалагічна чысты прадукт можна без праблем рэалізоўваць і за межы Беларусі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Толькі адзін беларускі пісьменнік моцна любіў цалаваць і ўвесь час цалаваў жаночыя ручкі. Такіх пісьменнікаў шмат, але гэты прыкладаўся вуснамі да жаночых ручак і жаночых пальчыкаў заўсёды, калі толькі мог. Я не люблю цалаваць жаночыя рукі і не люблю дарыць жанчынам букеты і вянкі, а таму мне было няёмка стаяць побач, калі Уладзімір Караткевіч нахіліўся да жаночай рукі. Ён нахіляецца, а ты стаіш і перапаўняешся няёмкасцю! Я стаяў і не нахіляўся, і не цалаваў, бо не бачыў у такіх пацалунках нічога пяшчотнага, вытанчанага і арыстакратычнага. Пустая гульня, нават пашлаватая гульня. Такая пашлаватасць пацалункаў жаночых ручак і абмяркоўвалася аднойчы з рэстаўратарам Ракіцкім. Ён і згадаў, як Уладзімір Караткевіч, ідучы з крамы, сустрэў нейкую жанчыну паважнага веку. У руках Караткевіча была сетка з бульбаю. Караткевіч нахіліўся да жаночай рукі і пацалаваў яе, у жаночай руцэ была таксама сетка з бульбаю. Выглядала так, што дзядзька Валодзя цалуе не толькі рукі, але і сеткі з бульбаю. Які арыстакратызм? Якая вытанчанасць? Якая рамантыка?

КАРАТКЕВІЧ І КАРЫКАТУРНАСЦЬ

У маладога пісьменніка Уладзіміра Караткевіча была карыкатурная знешнасць. У сваім чорным берэце ён выглядаў, як выдатна прамаляваная карыкатура на моднага літаратара. Паступова ягоная карыкатурнасць адшліфавалася ў кананічнасць. А раўналетні Караткевіча, якія некалі выдавалі сябе за традыцыяналістаў і класікаў беларускай літаратуры, цяпер выглядаюць пачварнымі выцвілымі, вартымі жалю карыкатурамі.

РАЗМОВА Ў АПТЭЦЫ

Старая аптэкарка бярэ ў маладой пакупніцы рэцэпт: «Вочы гнаяцца?» — «Гнаяцца». — «Моцна?» — «Здаецца, не так каб і моцна... Доктару лепей відаць! Ён жа ўсё напісаў». — «Не ўсё напісаў ваш доктар... Не ўсё! Вам лекі для дарослага ці для дзіцяці?» — «У мяне кот!»

МІЖНАРОДНАСЦЬ І ЖЫВЁЛЫ

Міжнародны форум, міжнародны саміт, міжнародны злёт, міжнародныя гульні, міжнародная выстава... Усе прызвычаіліся да міжнароднасці і міжнародных выстаў, так прызвычаіліся, што спакойна пішуць на афішы «Міжнародная выстава сабак». А што? Калі можна напісаць «Міжнародная выстава катоў», чаму нельга так і пра сабак? Толькі ў мяне пытанне паўстала іншае... А што за народы такія сабачыя? Варта было б напісаць «Міжнародная выстава людзей з сабакамі»? Не? Тады так «Выстава сабак з розных куткоў свету», каб без сабачых народаў, бо з сабачымі ды кацінымі народамі атрымліваецца не па-чалавечы.

СТРАЛЬЦОЎ І ШКАРПЭТКІ

Было позняе лета. Стаяла густая цяплынь. Міхась Стральцоў курыў у акно. На аконнай раме віселі две шкарпэткі. Паэт курыў і чакаў, пакуль летні ветрык падсушыць ягоныя шкарпэткі. Тады ў паэта была толькі адна пара шкарпэтак, але ў яго ўжо былі дзве дачкі і жонка-прыгажуня.

СМЕЦЦЕ НА ХОДНІКУ

Калі ты прыедзеш у новае месца і заўважыш сваю неадпаведнасць наваколлю, дык першае, што зробіш — перааранешся. Гэта ж так лёгка: набыў сабе майку, у якіх усе ходзяць, зрабіўся падобным да іншых і крыху зменшыў сваю неадпаведнасць. Праз пэўны час неадпаведнасці амаль не будзе. Ты зробішся такім, што чужынцы нават будуць у цябе пытацца дарогі. Ты ўздыхнеш з палёгкаю, але за палёгкаю на цябе наваліцца новы цяжар. Твой знешні выгляд, твая новая адпаведнасць увойдзе ў супярэчнасць з тваёй унутранай сутнасцю. Твая сутнасць будзе супярэчыць тваёй знешнасці. Падобны канфлікт некалі апісваў Міхась Стральцоў. Вяскоўца, які пераапрануўся ў гараджаніна, Стральцоў назваў «сенам на асфальце». Такі прамежкавы чалавек ужо не быў паўнавартасным вяскоўцам, але і гараджанінам ён не стаў. Гараджанамі сталі дзеці таго «сена», больш за тое, дзеці сталі не проста гараджанамі, яны дамагліся сваёй новай сталічнасці, сваёй новай дзяржаўнасці і новага грамадзянства. Праўду людзі кажуць, калі знаходзяць падабенства дзядоў у унукамі. Унукі таго самага «сена» сваю новую сталічнасць палічылі недасканалай і бесперспектыўнай, узялі лахі падпахі і выправілі ся ў вялікі свет шукаць лепшага жыцця. На новых месцах яны пераапрануліся, зрабіліся адпаведнымі наваколлю, востра адчулі супярэчнасць свайго вонкавага і ўнутранага свету ды вырашылі... Гэта самае смешнае і разам з тым драматычнае. Яны вырашылі навучыць сваю былую сталіцу пераапранацца. З усіх канцоў свету чуваць тоненькія галасочкі ўнукаў «сена на асфальце». Галасочкі спяваюць парады, прапановы і павучанні. У тоненькіх галасочках гучыць і шчымлівая крыўда на вялікі свет, і абурэнне раўнадушнай Радзімай. Самае важнае, што ты чуеш ў крыўдлівых спевах неадпаведнасць і супярэчнасць. Людзей, вядома, табе шкада, як было шкада Стральцову таго нікому не патрэбнага сена на сухім і чэрствым асфальце. З-за гэтай шкадобы ты спрабуеш прыдумаць новую метафару для неадпаведных і супярэчлівых людзей, табе хочацца захаваць сваю дабрыню, але, гледзячы на іх, нічога акром як «смецце на ходніку» не прыдумляецца. Мо нехта іншы прыдумае для ўнукаў «сена» нешта больш паэтычнае за «смецце». Можа, нават я сам і прыдумаю, крыху пазней...

Адам ГЛОБУС.

«ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ», 54-Я ВЕНЕЦЫЯНСКАЯ БІЕНАЛЕ —

падзеі мастацтва, за якімі варта сачыць

ПАДЗЕЯ ПЕРШАЯ. Вялікі агляд дасягненняў беларускага мастацтва адбудзецца ў межах выставы сучаснага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Зямля пад белымі крыламі», якая пройдзе з 3 верасня па 15 снежня па ўсёй краіне. Удзел у гэтай велізарнай выставе возьмуць мастакі з многіх гарадоў, што дасць і гледачам, і мастацтвазнаўцам шыкоўную магчымасць пазнаёміцца з мастацтвам, якое было створана ў незалежнай Беларусі.

— Вельмі важна, што да гэтай акцыі далучыліся не толькі сталічныя музеі, галерэі і мастакі, але і рэгіянальныя, — заўважае **Наталля ШАРАНГОВІЧ, дырэктар Музея сучаснага выяўленчага мастацтва** ў Мінску. — Кожная выставачная пляцоўка, на якой будуць адбывацца мерапрыемствы «Зямлі пад белымі крыламі», прапануе свае праграмы, у межах якіх будуць прадэманстраваныя, відаць, усе віды сучаснага мастацтва, якія існуюць у нашай краіне. Гэта эксперыментальны жывапіс і графіка, скульптура, відэа-арт, перформанс ... Мы пастараемся зрабіць такі сінтэтычны праект, з дапамогай якога можна будзе вызначыць, куды рухаецца наша маладое пакаленне, што такое беларускае актуальнае мастацтва.

Такіх маштабных выставаў-аглядаў беларускія мастакі не ведалі даўно. Здаецца, што самае вірлівае культурнае жыццё заўжды ў сталіцы. Але гэта далёка не так. «Зямля пад белымі крыламі» якраз і дапаможа выцягнуць на рэспубліканскую арт-сцэну цікавыя творы мастакоў з усіх абласцей. Дарэчы, паміж абласцямі будзе наладжаны абмен, які дазволіць жыхарам адной вобласці бліжэй пазнаёміцца з мастацтвам іншай. Аргкамітэт выставы запэўнівае, што членства ў Саюзе мастакоў не будзе вырашальным фактарам пры адборы работ, таму сапраўды атрымаецца зрэз сучаснага беларускага мастацтва ва ўсіх яго праявах і асобах. Шмат увагі таксама будзе нададзена творчасці народных мастакоў Беларусі і лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі, стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. У межах выставы можна пазнаёміцца і з творамі беларускіх мастакоў, якія жывуць за мяжой. У Нацыянальным мастацкім музеі, напрыклад, адбудзецца персанальная выстава Барыса Заборава, нашага земляка, аднаго з самых вядомых у свеце мастакоў, які каля 30 гадоў жыве ў Парыжы. Падрабязны расклад мерапрыемстваў рэспубліканскай выставы можна паглядзець на сайце Міністэрства культуры.

ПАДЗЕЯ ДРУГАЯ. Вось ужо, напэўна, паўгода, як беларускі мастацкі свет узрушаны навіной: нашы мастакі налета паедуць на Венецыянскае біенале. Упершыню незалежная Беларусь брала ўдзел у Венецыянскай біенале ў 2005 годзе. Тады куратарам і камісарам беларускага павільёна быў італьянец, арт-дырэктар адной з мастацкіх кампаній. І беларускае мастацтва прадстаўлялі такія выбітныя творцы, як Уладзімір Цэслер і Сяргей Войчанка, Ігар Цішын, Наталля Залозная, Андрэй Задорын, Леанід Хобатаў, Руслан Вашкевіч, Валерый Шкаруба... Але сёлетнія зборы беларусаў на біенале адрозніваюцца ад папярэдніх тым, што гэта будзе цалкам наш праект: з нашымі кураторамі, з нашым падыходам, з уласным павільёнам у цэнтры Венецыі. І ўсё гэта па ініцыятыве і пры падтрымцы нашага ж Міністэрства культуры.

— З чэрвеня па лістапад 2011 года на Венецыянскай біенале будзе працаваць Нацыянальны павільён Рэспублікі Беларусь, — распавядае **Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ, першы намеснік міністра культуры**. — На ім будуць дэманстравацца найбольш яркія творы сучаснага беларускага мастацтва. Цяпер вырашаецца, якія менавіта аўтары будуць удзельнічаць. У нас больш за 30 кандыдатаў... Ужо створаны аргкамітэт, група па падрыхтоўцы экспазіцыі, абраны камісар і куратар.

— Удзел Беларусі ў мегафорумах кшталту Венецыянскай біенале заўжды вельмі важная падзея, — адзначае Наталля Шаранговіч, камісар Нацыянальнага павільёна Рэспублікі Белаурсь. — Менавіта таму, што гэта цудоўная магчымасць нашай краіны з вельмі яскравай і дынамічнай выяўленчай культурай заявіць пра сябе на сусветнай арт-сцэне. Там наша мастацтва пакуль застаецца таямніцай, загадкай.

Венецыянская біенале — гэта заўжды нечаканасць. Мастацтва, якое там пануе, кардынальна адрозніваецца ад таго мастацтва, да якога, можа быць, прывыкла пераважная большасць беларусаў. Гэта не зразумелыя карціны ў залатых рамах, а нечаканыя, эпатажныя, эксперыментальныя арт-аб'екты, інсталяцыі, часам нават творы тэатральнага і кіна-мастацтва.

— Венецыянская біенале — фестываль канцэптуальнага мастацтва, мастацтва ідэй, — падкрэслівае Міхаіл Баразна, куратар Нацыянальнага павільёна, прарэктар па навуковай рабоце Беларускай акадэміі мастацтваў. — Таму пры выбары экспанатаў для нашай экспазіцыі мы будзем адштурхвацца менавіта ад гэтага. Усяго Беларусь прадставяць прыблізна 3-5 аўтараў.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

РОДАМ З БЕЛЫХ РОСАЎ...

Сёння 40 дзён з дня смерці выбітнага беларускага кінарэжысёра Ігара Дабралюбава

ПАПРАЎДЗЕ, пра яго хочацца гаварыць толькі добрае. А нешта новае сказаць вельмі цяжка: настолькі ён значны і любімы для беларускага кінематографа, што ўсе ўхвальныя словы ў ягоны адрас, відаць, ужо скарыстаныя. Засталося толькі паўтарацца... Часам здаецца, што Ігар Міхайлавіч сам быў родам з нейкага міфічнага светлага месца пад назвай «Белыя росы», аднайменнага з ягоным самым вядомым фільмам. Настолькі ён быў чысты, верны і свой. Вось як, памятаеце, у адным з апошніх эпізодаў стужкі Ходас распавядае легенду пра белых росаў:

— Не вёску, значыць, так празвалі, а людзей... Продкаў, значыць, нашых белымі ро-

самі ахрысцілі...

— А чаму белымі? — запратэставаў Гастрыт. — Што, у нас тады рудых ці лысых не было?..

Ходас удакладніў:

— Ну, белыя — гэта значыць чыстыя... Верныя... Свае...

Аляксей Дудараў, аўтар сцэнара «Белых росаў», шчыльна пасябраваў з Ігарам Дабралюбавым на здымках фільма. І, як сам прызнаецца, многаму навучыўся ў беларускага рэжысёра. «Звязда» папрасіла Аляксея Ануфрыевіча падзяліцца сваімі згадкамі пра здымкі легендарнай беларускай камедыі і яе неўміручага аўтара-рэжысёра.

— Калі я ўзгадваю здымкі «Белых росаў», то перш за ўсё мне ў сэрца прыходзіць цеплыня... Ігар Міхайлавіч, прачытаўшы мой сцэнар, пачаў ствараць сям'ю. Не здымкавую групу збіраць, а менавіта ствараць сям'ю. І ён яе стварыў. А гэтая сям'я, у сваю чаргу, стварыла такі незразумелы цуд як «Белыя росы». Поспех «Белых росаў» і для мяне загадка. Там жа, на першае вока, нічога асаблівага няма: ні спецэфектаў, ні нечаканых сюжэтных паваротаў... Там проста такая сардэчная павага да чалавека, да ягонага бурлівага, складанага жыцця, да гісторыі... Відаць, толькі маючы такое прозвішча як Дабралюбаў, злучыўшы ў сабе добро і любоў, можна было стварыць такі шчыры «чапляльны» фільм. Дабралюбаў сам сабе стварыў помнік! Я асабіста яму вельмі ўдзячны за тое, што ён вельмі ашчадна і далікатна ставіўся да першаасновы — сцэнара. Ён быў з тых рэжысёраў, якія верылі, што пачатак — гэта літаратура, а фільм — гэта яе працяг. Ён умеў слухаць і любіць людзей, з якімі працаваў.

Яшчэ да працы над «Белымі Росамі» мы віталіся з Ігарам Міхайлавічам на мастацкіх сходах, былі, так сказаць, знаёмыя, але не блізка. Мяне заўжды захапляла, што ён ставіўся да ўсяго некатэгарычна, заўсёды думаў, стараўся падтрымаць, зразумець. І я заўжды спрабаваў у яго навучыцца некатэгарычнасці, таму што мне самому яе бракуе. Яго кампрамісназць была не ў загану яго прынцыповасці. Усё, што ён задумваў, ён увасабляў. Ён не быў гнуткім, яго сагнуць немагчыма было, але ён быў дыпламатычным.

У свой час паводле конкурсу кінастудыі «Беларусьфільм» сцэнар «Белыя росы» атрымаў першую прэмію. Не магу сказаць, што пасля гэтага на мяне пасыпаліся прапановы ад рэжысёраў... Яны, наадварот, неяк досыць прахалодна паставіліся. Але аднойчы мне патэлефанаваў Ігар Дабралюбаў: «Лёша, я пачытаў твой сцэнар. Нічога лепшага я да гэтага не чытаў. І калі ты не супраць (во які тактоўны быў чалавек!), я гатовы над ім працаваць». Я ледзь слухаўку з рук не выпусціў! Я ж тады быў літаратар-пачатковец, які толькі падае надзеі, а Ігар Міхайлавіч — маэстра! Зразумела, я быў не супраць. Пасля гэтага мы багата з ім сустракаліся, гаварылі. Я па сваёй ініцыятыве на магнітафон начытаў яму кінасцэнар. Таму што некаторыя рэчы словамі не растлумачыш. Іх трэба дзе інтанацыяй вылучыць, дзе паўзамі... А я сваіх герояў адчуваў. І вось гэтую інтанацыю мала таго, што Дабралюбаў захаваў, дык ён яшчэ і дадаў багата свайго, развіваючы гэтую інтанацыю! Яна і перайшла на стужку, а са стужкі на экран. І вось ужо хутка 30 гадоў, як фільм уздзейнічае. Ён неяк па-за часам. Чаму людзі сталага веку глядзяць — зразумела. Але ж і моладзь глядзіць, для якой вёска тая — толькі кіно. Калі нешта пасапраўднаму ствараецца, калі «над вымыслам слязамі абальюся» — той, хто будзе глядзець і чытаць, таксама абальецца!

Аднойчы Ігар Міхайлавіч патэлефанаваў і прапанаваў паехаць у Смалявічы на рыбу. Там, маўляў, база ёсць: ёсць, дзе пераначаваць. А гэта было падчас працы над рэжысёрскім сцэнарыя «Белых росаў». Але ён мяне не на пікнік клікаў, бо зусім не піў. Ні кроплі! Ні піва, ні гарэлкі, ні іншага! Ва ўсялякім разе з ім я чарку ніколі не падымаў, толькі пры ім. Ну, паехалі. А гэта ўжо восень. Халодна. Рыба не ловіцца. Сядзім з ім, мерзнем на беразе, і тут ён здалёк пачынае: «Ведаеш, Лёша, там у адным месцы патрэбна жанравая сцэнка. Накшталт такой, як з Валетам, толькі нешта іншае, каб не было паўтараў». Тады я і зразумеў, чаму гэта Ігар Міхайлавіч мяне на рыбу вывез! Я пайшоў у наш домік і за пятнаццаць хвілін (гэта я не хвалюся!) напісаў сцэну, калі Гастрыт лечыць Ходаса гарачай цаглінай. Аднёс Дабралюбаву. «Тое, што трэба!»— ухваліў ён, і мы вырашылі вяртацца ў горад. Так вось з'ездзілі, падыхалі свежым паветрам і плёна папрацавалі.

Ёсць адзін эпізод у «Белых росах», які пісаў не я. Яго напісаў артыст Барыс Кузьміч Новікаў. Падчас працы над заключнымі сцэнамі вяселля сярэдняга сына ён пачаў прыставаць да Ігара Міхайлавіча, што, маўляў, трэба «паставіць кропку з Валетам». І прапанаваў эпізод, калі Гастрыт з вясельнага стала набірае свайму Валету пачастунак і так тужліва прыгаворвае: «А гары яно ўсё гарам! І цешча, і Валет, і гэтыя далікатэсы!». Ну, Дабралюбаў дазволіў паспрабаваць, сказаў аператару: «Ладна, уключы камеру, няхай ён там робіць, што хоча. Калі што — выражам!». А аказалася, што гэта геніяльна проста! Барыс Новікаў таленавітыя мастак, ён адчуў, што адбываецца ж насамрэч трагедыя на такім добрым фоне. З хат вяскоўцаў перасяляюць у кватэры — радавацца б. А гэта трагедыя, таму што яны там доўга не пражывуць. І Валет на балконе жыць не зможа...

Ігар Міхайлавіч ніколі не быў дыктатарам на здымачнай пляцоўцы, ніколі не нервавaўся, не «пантаваўся», як, бывае, іншыя рэжысёры. Ён падыходзіў да чалавека і сваім грудным ветлівым голасам нешта тлумачыў, казаў. Ён настройваў чалавека менавіта на такі спакойны, разважлівы, лагодны лад, у стане якога шукаюць ісціну. Так ён і з усімі «зоркамі» працаваў. І ўсе яго слухаліся і паважалі. І Усевалад Санаеў, легендарны савецкі актор, які на той час быў санавіцейшы за Дабралюбава, і малады імпэтны Мікалай Карачанцаў... Можа, і здараліся нейкія непаразуменні, але Дабралюбаў валодаў талентам «разрульваць» складаныя сітуацыі і не псаваць атмасферы. Атмасфера на здымках «Белых росаў» заўжды была акурат такая ж, як і ў самім фільме.

Ігар Міхайлавіч стрэс не здымаў. Курыў ён багата, смаліў адну за адной. Але зусім не піў. Ну, а артысты як стрэс здымаюць? Як і ўсе людзі...

Памятаю адзін шчымлівы момант, калі агучвалі апошні эпізод. Якраз агучвалі Санаеў з Новікавым. Дабралюбаў адобрыў. Спытаў, ці ёсць у мяне заўвагі (я заўжды прысутнічаў на агучках, і ён заўжды пытаў маё меркаванне). У мяне заўваг не было, і Ігар Міхайлавіч сказаў: «Усім дзякуй! Праца скончана!» І тут Новікаў з Санаевым кідаюцца да Дабралюбава і пачынаюць яго пераконваць, што эпізод трэба пераагучыць. Прыводзяць там нейкія аргументы кшталту «Я не ў тым месцы ўздыхнуў.»А Дабралюбаў маўчыць, глядзіць на іх са сваёй характэрнай такой добрай усмешкай. А потым ізноў да мяне: «Лёша, у цябе ёсць што-небудзь?». Я адмоўна кручу галавой. «Ну, тады ўсё!» — гаворыць Дабралюбаў, і мы бачым, як спакваля на вачах Санаева і Новікава з'яўляюцца слёзы... «Развітвацца не хочуць. Спрацавалі», — ціхенька кажа мне Ігар Міхайлавіч.

«Белыя росы» — гэта народны фільм і ў Беларусі, і ва Украіне, і ў Расіі, і ў Казахстане... Таму што талент нацыянальнасці не мае. Майстар адчувае сапраўднае, а Ігар Дабралюбаў быў Майстрам. А сапраўднае для ўсіх аднолькавае. Нацыянальнае яно толькі па форме. Не ведаю, праўда, як «Белыя росы» ў Афрыцы, напрыклад, успрымаюць... Але тое, што гэта фільм славянскі, сумневаў няма. Не савецкі, а менавіта славянскі. Самае галоўнае, што там багата любові і дабра, а гэта патрэбна ўсім.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

ІСКРЫНКА І ПОЛЫМЯ

ГАЛІНА КАРЖАНЕЎСКАЯ — аўтар больш як дзесяці кніг паэзіі і драматургіі. Яна піша і пранікнёныя патрыятычныя тэксты, і філасофскую лірыку, і чуллівыя дзіцячыя вершы, і п'есы, казкі, нарысы... Апошні па часе яе зборнік «Вершаняты» пабачыў свет у 2005 годзе ў выдавецтве «Беллітфонд». Зусім нядаўна выйшла кніжка сцэнічных мініяцюр. З'яўляюцца публікацыі ў прэсе. У паэткі і прафесіі былі разнастайныя. Ёй давялося папрацаваць бадай ва ўсіх гуманітарных сферах: настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, рэдактарам літаратурна-драматычнай часткі Беларускага тэлебачання, карэспандэнтам аддзела прозы і паэзіі, а пасля загадчыкам аддзела крытыкі газеты «Літаратура і мастацтва»... «Звязда» сустрэлася з сённяшняй юбіляркай, каб павіншаваць і задаць некалькі пытанняў.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Спадарыня Галіна, у вашай бібліяграфіі шмат кніг. Адкуль вы бераце столькі натхнення?

— Ну, не так ужо і шмат! Ёсць аўтары, у якіх выданняў болей. Рэч у тым, што я працую ў розных жанрах. Можна лічыць гэта маёй асаблівасцю як творцы. А натхненне... Яно адкуль хочаш прыйдзе. Ад роснай павуцінкі, ад жоўтага ліста на плыні ракі, ад узвышанага пачуцця, нават ад паспяхова зробленай справы. Ёсць у творчага чалавека ў душы нейкі імпульс, з якім ён, відаць, нарадзіўся. Імпульс можа развівацца, а можа заглохнуць. Як тая іскрынка. Яна можа стаць зыркім полымем, а можа патухнуць. Жыве такі імпульс і ў маёй душы, і час ад часу выяўляецца то вершамі, то іншымі творамі...

— Што вы думаеце пра маладую беларускую паэзію? Можа, ёсць у вас улюбёныя аўтары?

— Пра маладую паэзію я магу толькі сказаць, што яна жыве... Я чытаю цяпер у асноўным тое, што трапляецца ў перыёдыцы, а гэта такая рэч — стракатая. Цяжка скласці ўражанне. Але ёсць адзін аўтар, за развіццём якога я сачу: гэта Аксана Данільчык.

— А што б вы пажадалі маладым творцам?

— Быць сабой, ні пад каго не падрабляцца, ні ў кога не перайманць. Не глядзець ні на Захад, ні на Усход, а толькі ў сваю існасць. Тая самая іскрынка, калі быць да яе ўважлівым, выведзе на правільную дарогу любога творцу — і хто рана пачаў пісаць, і хто на пенсіі. Менавіта на ягоную дарогу, адзіную і непаўторную.

— Каго вы лічыце сваімі настаўнікамі ў паэзіі?

— Мяне заўжды кранала паэзія Аркадзя Куляшова. Але яго самога жывым я ўжо не пабачыла. Ён для мяне і цяпер застаецца выключным майстрам, класікам. Але не тым майстрам, які проста цацкаецца са словамі і так перабірае з формай, што зместу пасля не вылушчыць... Успамінаю свае першыя спробы пяра (яшчэ ў школе). Іх падтрымалі мае настаўніцы-філалагіні. Першая публікацыя ў рэспубліканскім друку была ў «Маладосці». Тады ў часопісе працавалі Міхась Стральцоў, Мікола Аўрамчык... Яны таксама заўжды мне спрыялі, падтрымлівалі ў творчасці. Як і многія іншыя, каму я дасюль удзячная. А вось маім настаўнікам у драматургіі быў Андрэй Макаёнак. Яму я на першых яшчэ творчых семінарах падчас вучобы на філфаку паказала сшытачак са сваімі спробамі. І мэтр не паленаваўся, прачытаў той сшытачак, паказаў мне, што добра, а над чым і папрацаваць трэба. Гэта, дарэчы, была аднаактавая п'еса «Зуб мудрасці».

— Спадарыня Галіна, самі вы са Случчыны. Ці часта бываеце на малой радзіме?

— Якраз збіраюся туды напярэдадні юбілею. Але апошнім часам усё радзей і радзей там бываю... Дарэчы, сама сабе да круглай даты зрабіла падарунак — напісала гісторыю роднай вёскі Лясішча. Некалі мне сказалі, што мой сваяк са Слуцка, Аркадзь Кашавар, збірае матэрыялы па гісторыі роднага краю і вёскі. Я з ім пагаварыла, паглядзела, што ў яго ёсць, і зразумела, што ўсё гэта асэнсаваць, «выстраіць» і афарміць будзе няпроста. Узялася сама. Атрымаўся нарыс-успамін пра жыццё землякоў і майго дзеда, там ёсць драбніцы, пра якія мала хто ведае і якія маглі проста знікнуць, прапасці, сысці ў нябыт... Я проста шчаслівая, што мне ўдалося завяршыць і надрукаваць гэты нарыс.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ

* * *

Між вод акіянскіх,
на лапіках сушы
Прыходзяць пажыць
усё новыя душы.

Да розных народаў,
у кліматах розных,
Хто болей, хто меней,
хто рана, хто позна.

Хто ў сем'ях заможных,
а хто сіратою
Свой век адбывае
на пару з бядою.

І кожны аднойчы –
глухі, безгалосы –
Апошні свой выдых
пашле да нябёсаў.

І толькі анёл
разбярэ на мяжы
Дакор, што пакутваў,
падзяку, што жыў.

Пра кнігу і кніжнікаў

Дзённік бландзінкі

ЦЯЖКАСЦІ ПЕРАКЛАДУ

Іншым разам хочаш расказаць пра нешта, а не хапае слова, таго адзінага паняцця, якое б выявіла з'яву ва ўсёй яе паўнаце.

Вось, напрыклад, рускае слова «лицемерие». Яго перакладаюць на беларускую як «крывадушнасць», «аблуднасць», «хітлянасць». Аднак, як слушна заўважыў знаны мастак-авангардыст Анатоль Брусілоўскі, «рускія словы «лицемерие», «неискренность» і нават славутая «хитрожо...» ніякіх сувязяў з душой не маюць, і правільна... Душа — вышэй гарызонтам».

Такі пераклад не зусім адэкватны яшчэ і таму, што не ўлічвае адзін момант, які ёсць у паводзінах таго, хто прымярае на сябе розныя абліччы. І момант гэты — абставіны. Беларускае слова «крывадушша» хутчэй асацыюецца з чалавечай якасцю, рускае «лицемерие» — спосаб паводзінаў у пэўных абставінах.

«Тварамеры» — назавём іх так! — свядома парушаюць прынцыпы, якія прапаведуюць. Ці робяць нешта ўпоперак сваім ранейшым дзеянням ды абяцанкам. Гэта зазвычай дзеячы палітыкі ці рэлігіі. Хрэстаматыйны «тварамер» — Тарцюф. Куды менш вядомы другі літаратурны святар — дон Мануэль. У творы Мігеля дэ Унамуна «Святы Мануэль Добры, пакутнік» ён страчвае веру, але працягвае гуляць у верніка, якім яго ведае паства. Такія паводзіны ён лічыць адзіна слушнымі, бо добра ўсведамляе сваю сацыяльную ролю. Дон Мануэль мае сумневы ў рэлігійных асновах таго, што прапаведуе, таму ён няшчыры, але ён не тварамер, бо працягвае дзейнічаць адпаведна з перакананнямі. Проста са стратай веры яго матывацыя стала не рэлігійнай, а прагматычнай. Чаму мы не асуджаем дона Мануэля? Бо ён так дзейнічае не з уласнай карыслівасці, а ад любові і павагі да людзей.

У кожным, хто працуе на ніве мастацкай крытыкі ў Беларусі, сядзіць дон Мануэль. Той, хто шчыра верыць, што дзеля таго, каб беларусы пазбавіліся сваіх посткаланіяльных комплексаў, трэба ім безупынна распавядаць пра росквіт нацыянальнай культуры. Бо як можна займацца нацыябудаўніцтвам і не верыць у моц нацыянальных літаратуры, выяўленчага мастацтва, тэатра, музыкі?!

Нацыянальнае ўвязанае ў культуру, як муха ў мёд! Таму крытыкі ідуць папарадзе нацыятварэння, як Сусанін папарадзе «варожага» атраду. Асабліва гэта датычыць літаратуры: няма нацыянальнай літаратуры — няма мовы, няма сваёй мовы — няма самастойнасці, няма самастойнасці — няма дзяржавы... А што рабіць, калі верыш у гэтую трыяду, але не верыш у беларускую літаратуру? Не, яе становішча не горшае, чым, скажам, у літоўскай літаратуры. Але рэальна беларускіх аўтараў ніхто не ведае ў твар, іх кнігі стаяць у самых невыгодных месцах у крамах, новыя творы амаль не рэкламуюцца. Калі на кулуарную прэзентацыю — а іншых ужо і няма! — збярэцца чалавек сорак, дык аўтар нос задзірае: бач ты, які ён папулярны! А што акрамя тых сарака ніхто кнігу не пабачыць, то не бяда — можна ганарыцца сваёй «элітарнасцю». Але ж нават калі што і трапіць да чытача — рэдка калі апраўдвае чаканні. Дарэчы, і не толькі кніга — тое ж і з канцэртамі, і са спектаклямі, якія даўно ўжо звыклі да фармату «кватэрніка».

І што тут рабіць крытыку з яго добрымі намерамі? Хлусіць чытачу, што цікавыя творы насамрэч ёсць, але невядома, дзе можна да іх далучыцца? Выхоўваць у ім густ да таго, што знаходзіцца на адлегласці выцягнутай рукі? Пісаць толькі пра тых творцаў, якія яму падабаюцца і за якіх яму хоць не сорамна? Не пісаць наогул, чакаючы, што сітуацыя сама неяк развяжацца?

Але колькі можна маўчаць, як дон Мануэль? Ці хлусіць і выдаваць жаданае за рэальнае? Чытачы і гледачы ў нас таксама не дурныя, яны разумеюць, што адсутнасць крытыкі — гэта таксама крытыка. Толькі не асобных твораў ці аўтараў, а ўсёй культуры. Што адсутнасць крытыкі — гэта культурная хвароба, як анемія, калі крыві не хапае жалеза.

І тут, здавалася б, усё проста: паставіў дыягназ — выпісвай лекі! Убі ў белакроўнае цела літаратуры пару сталёвых цвічкоў ці наладзь нармальнае функцыянаванне кровазвароту. Вось толькі позна, аказваецца, лячыць — культура ад крытыкі адвыкла зусім. Як дзіця, якое кармілі сабой мамка да позняга ўзросту, культура не можа пераварваць цвёрдыя і нават паўцвёрдыя кавалкі крытыкі. І замест таго, каб дзеля сваёй жа карысці, далейшага развіцця, неяк прыстасавацца да таго, што бывае не толькі мяккае і салодкае, пачынае капрызіць ды істэрыць. На кожную крытычную заўвагу творцы цяпер адбрэхваюцца... Або «сам дурань». Або — «ты кадэбіст». Або — «ты антысеміт». Або — «ты не з майго творчага саюза». Або — «гэта ўсё ад зайздрасці»! І гэта ў найлепшым выпадку, бо ў найгоршым яны пагражаюць судом і «набітай мордай»!

Такое ўражанне, што творцы ўспрымаюць крытыку выключна са свайго ўласнага досведу, і досвед гэты часта проста ганебны. Але асабліва камічна, калі творцы з сур'ёзнымі мінамі распавядаюць: «Мяне ЗАМОВІЛІ!» Так і хочацца сказаць: «Прачніся, нікому ты не патрэбны, акрамя такога ж гаротніка-інтэлектуала, які за адну базавую велічыню гаворыць праўду, і тое выключна для таго, каб выратаваць уласную душу. Песці і даглядай свайго крытыка — мажліва, ён твой адзіны чытач ці слухач!»

А да таго ж — песці і даглядай свайго калегу па прафесіі. Ён таксама можа аказацца адзіным спажыўцом тваёй творчасці!

Трагікамічная гутарка адбылася днямі ў інтэрнэце.

— Для каго я пішу раман па-беларуску, з абсалютна некамерцыйным зместам? — пытаецца пісьменнік А.

— Цікава, калі адкажу «для мяне» — ці буду арыгінальным? — адказвае пытаннем на пытанне пісьменнік Б.

Піс

Ён + Яна

Шопінг супраць сумлення

НЯМА сэнсу вінаваціць жанчыну ў тым, што Яна патраціла занадта шмат грошай на «анучы». Хутчэй за ўсё, жанчына ўжо даўно вінаваціць сябе сама.

Як высветлілі брытанскія сацыёлагі, восем з дзесяці жанчын адчуваюць дакоры сумлення пасля паходаў па крамах. Яны адчуваюць віну за тое, што патрацілі некалькі гадзін на выбар і набыццё для сябе новых адзення, абутку або аксесуараў.

У трох чвэрцяў прадстаўніц слабага полу згрызоты сумлення пачынаюцца ўжо ў краме, часам нават яшчэ да таго, як яны заплацілі за пакупку. Але ўсе гэтыя душэўныя пакуты не спыняюць ні адну з жанчын ад набыцця ўпадабанай рэчы.

Дзевяць з дзесяці жанчын настойліва спрабуюць апраўдаць неабходнасць гэтых пакупак, і толькі 10 % лічаць за лепшае проста схаваць чэкі ад блізкіх. Падчас даследавання высветлілася, што кожная трэцяя дама цяпер адчувае сябе больш вінаватай за сваю страсць да шопінгу, чым да наступлення фінансавага крызісу.

Палова жанчын скараціла асабістыя выдаткі з-за крызісу, а 7 працэнтаў, наадварот, трацяць яшчэ больш, каб хоць неяк падбадзёрыць сябе. І сапраўды — продажы дызайнерскіх сумак за апошні «крызісны» год рэзка ўзляцелі. Дарэчы, мужчыны паводзяць сябе больш адказна. За той жа год аб'ёмы продажу дарагіх гадзіннікаў, якія так любіць набываць моцны пол, рэзка ўпалі.

Жаночая помста больш небяспечная

БРЫТАНСКІЯ сацыёлагі зафіксавалі рэзкі рост колькасці дам, якія хапаюцца за кухонныя нажы, качалкі і цяжкія патэльні, каб высветліць адносіны са сваімі блізкімі.

Але ў той жа самы час колькасць прадстаўніц слабага полу, якія пацярпелі ад мужчынскага хатняга гвалту, вырасла ў два разы! Жанчыны значна часцей пакутуюць ад шматразовага збівання.

У даследаванні, якое было праведзена групай сацыёлагаў Брыстальскага ўніверсітэта, гаворыцца пра тое, што мужчыны нашмат часцей выкарыстоўваюць фізічную сілу супраць жанчын, чым жанчыны супраць мужчын.

Цікава, што пры гэтым у жанчын у тры разы вышэйшыя шанцы быць арыштаванымі за хатні гвалт, чым у мужчын. З чым жа гэта звязана? На жаль, жанчыны часта трываюць збіванне, лічачы за лепшае не ўмешваць у сямейныя справы вартавых парадку. Калі ж іх цярпенне заканчваецца, то яны ў прыступе адчаю або стане афекту хапаюцца за нажы і іншыя кухонныя прадметы, небяспечныя для жыцця. Жаночая рэакцыя на мужчынскі гвалт нясе за сабой куды больш сумныя наступствы, чым цяжкія мужчынскія кулакі.

Як ні дзіўна, але і на адукаваным Захадзе ўсё яшчэ прызнаецца дзікая па сваёй бессэнсоўнасці

руская прыказка «Б'е — значыць кахае». Прычым яе аднолькава ўстойліва ўспрымаюць як мужчыны, так і жанчыны. Хтосьці з дам баіцца застацца без партнёра, хай нават і жорсткага, а хтосьці сапраўды лічыць рэўнасць і гвалт з боку мужчыны праявай яго асаблівых пачуццяў.

Чаму спяваюцца разумныя дамы?

БРЫТАНСКІЯ навукоўцы выявілі, што з усіх жанчын часцей за іншых пакутуюць ад алкагалізму адукаваныя.

Эксперты-сацыёлагі прасачылі за тым, хто колькі п'е. Высветлілася, што жанчыны з добрай адукацыяй співаліся часцей за астатніх. А ў далейшых даследаваннях навукоўцы вызначылі, што схільнасць да алкагалізму ў дам можна прадказаць яшчэ ў пачатковай школе: хто ў падрыхтоўчым класе быў больш паспяховай, амаль напэўна стане непрабудна піць.

Навукоўцы збянтэжаныя — як звязана паспяховасць лэдзі і яе алкагольная залежнасць? Чаму самыя разумныя з іх спяваюцца? Даследчыкі прыйшлі да высновы, што адкладзеныя сямейнае шчасце і радасць мацярынства, уласцівыя жанчынам, якія робяць кар'еру, у выніку прыводзяць іх да неўладкаванага асабістага жыцця. Кола зносінаў такіх дам складаецца, у асноўным, з дзелавых мужчын, якія таксама не супраць «паддаць». Вось і даводзіцца адпавядаць. А жаночы алкагалізм, як вядома, не лечыцца.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



	4			7	3				
7					4		3		
8	3			2					
	2			9					
			3		2	5	9		
			8				6	2	
		6				9	4		
3		9					7	1	
	8			1					

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетак, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (24 жніўня). Па гарызанталі: Слон. Ром. Аман. Факт. Пракос. Ахіл. Беркут. Літр. Ялта. Афрыка. Актыній. Злак. Рапс. Юта. Тычынка. Івасі. Бэла. Сапега. Нірвана. Рана. Выбух. Канат. Паляк. Класіка. Одум. Шабліст. Танкіст. **Па вертыкалі:** Грыф. Арол. Лютэр. Тратыл. Туба. Качан. Сокал. «Нерв». Прарок. Выспа. Араб. Асот. Самакат. Нуклід. Мох. Посах. Якут. Асілак. Кама. Неон. Ліфт. Сіп. Трыр. Вера. Ярына. Аган. Кіп. Сана. Райскі. Атрыбут.

Сканворд (25 жніўня). Па гарызанталі: Праектар. Лярд. Соя. Нача. Зэт. Пяндж. Граб. Ураза. Лато. Кольт. Тан. Твар. Чан. Шнур. Ампула. Табу. Дар. Ачаг. Анкара. Бар. Язык. Кош. Брак. Манна. Вар. Стопар. Рада. Алан. Тона. Грамата. **Па вертыкалі:** Гваздзіка. Тандэм. Талон. Табун. Удача. Тур. Баркас. Аніс. Луг. Нут. Шворан. Каляндра. Апала. Ажан. Здрада. Абруч. Ранг. Агата. Акт. Кмен. Калач. Куб. Баракуда. Тон. Ларга. Стог. Чара. Карыца.

ЧАЛАВЕЧЫЯ АСТАНКІ ЗНОЙДЗЕНЫЯ Ў СЛУЦКУ

У аўторак у Слуцку пры правядзенні земляробчых работ знойдзены чалавечыя астанкі.

На вуліцы Манахава каля дома № 19 на глыбіні паўтара метра пяць чалавечых чэрапаў і косці знайшоў майстар баранавіцкага прадпрыемства падчас пракладкі газаправода. Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, астанкі адносяцца да часу Вялікай Айчыннай вайны. У цяперашні час кампетэнтныя органы праводзяць праверку.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Карысна ведаць

НОЎТБУКІ МОГУЦЬ «ПАДСМАЖЫЦЬ» НОГІ

Ноўтбук трывала ўвайшоў у жыццё людзей. Перш-наперш ён прыцягвае сваёй зручнасцю: працаваць на ім можна дзе заўгодна — седзячы ў аўтобусе, адпачываючы ў крэсле-качалцы, лежачы на траўцы на лужку. Аднак шырокае распаўсюджванне камп'ютарнай тэхнікі не такое бяспечнае — працяглае трыманне «букаў» на каленях прыводзіць да апёкаў.

У Швецыі з кожным годам фіксуецца ўсё больш выпадкаў апёкаў скуры, выкліканых працай на партатыўным камп'ютары. З'яўленне чырвона-карычневых плямаў звязанае з тым, што вентылятары і акумулятары награваюць скуру і правакуюць так званы «сіндром падгарэлай скуры». Часцей за ўсё захворванне дыягнастуецца ў маладых людзей — самых актыўных карыстальнікаў ноўтбукаў. Таксама ў ліку пацярпелых нямала падлеткаў, ёсць і дзеці.

Вялікай шкоды чалавечаму арганізму такі апёк не нанясе, але варта ведаць, што «падсмажваюцца», як правіла, ногі з левага боку, там, дзе ў ноўтбука размешчаныя вентылятары, якія ў працэсе работы ствараюць гарачыню. Скура награваецца да тэмпературы прыкладна 50 градусаў, што пакідае на ёй карычневыя плямы. Дэрматолагі сцвярджаюць, што гэтае захворванне небяспекі не ўяўляе, але такія плямы вельмі доўга загойваюцца — ад 3 да 6 месяцаў — усё залежыць ад адчувальнасці скурнага покрыва пацыента. Таму медыкі заклікаюць карыстальнікаў абмежаваць час працы з ноўтбукам, трымаючы яго на каленях.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

МТС — аграгарадкам

ЯБЛЫЧНЫ СПАС — УСЯМУ ЧАС

«Яблычны Спас — усяму час», — кажуць у народзе. У вёсцы Малыя Алашкі Шаркоўшчынскага раёна традыцыйна праводзяць фестываль пад такой назвай і прысвячаюць яго памяці легендарнага земляка, вядомага беларускага садавода-селекцыянера Івана Паўлавіча Сікоры.

У памяць аб ім створаны і дзейнічае на Шаркоўшчынскай зямлі пасвойму ўнікальны музей. У музейны комплекс уваходзіць і сад, аснову якога заклаў сам Іван Паўлавіч.

Цяпер музейныя работнікі пры дапамозе ахвотных працягваюць гэтую добрую справу. Дарэчы, пабываўшы на экскурсіі на малой радзіме садавода, можна купіць тут саджанцы яблынь, груш...

Іван Сікора шмат часу прысвяціў стварэнню гатунку яблыні, якая як мага лепш зможа пераносіць халады. На жаль, ён не паспеў поўнасцю завяршыць гэтую справу пры жыцці. Дапамаглі аднадумцы, якія так і назвалі гэты гатунак — «Памяць Сікоры». Нават у тэксце гімна раёна ёсць радкі, прысвечаныя садаводу: «А Сікоры сады як пачнуць расцвітаць, іх духмянасць па ўсёй Беларусі чуваць»...

Святкаванне Яблычнага Спаса — добрая нагода для вандроўкі. Па традыцыі ў гэты час у беларускую глыбінку прыязджаюць дзясяткі людзей — не толькі землякі з раёна, але і з усёй Беларусі. Наведаць

музей, пазнаёміцца з цікавымі экспанатамі, якія распавядаюць пра жыццё і дзейнасць Садавода з вялікай літары, паспытаць цудоўныя яблыкі — як усё гэта здорава!

Шаркоўшчынскі раён — вельмі прыцягальны для экскурсій па ім у любы час. Райцэнтру — гарадскому пасёлку Шаркоўшчына — больш за 500 гадоў. На беразе Дзісны ў меней чым 200 кіламетрах ад сталіцы Беларусі знаходзіцца гэты ціхі, утульны і вельмі прыгожы гарадок з насельніцтвам больш за сем тысяч чалавек. Ён месціцца ў нізіне ля ракі, вакол яго на балотах шмат дзікаросłых ягад, асабліва брусніц. Таму не дзіва, што «ягадныя элементы» можна знайсці і на афіцыйным гербе Шаркоўшчыны.

На тэрыторыі раёна, па якім цячэ Дзісна і яе прытокі, больш за дзесяць азёр. Дзейнічае гідралагічны заказнік «Ельня». Так што прыязджайце адпачыць, палавіць рыбку, пакатацца на лодках.

Усяго ў раёне знаходзяцца каля 60 помнікаў культуры і архітэктуры, у тым ліку і некалькі старых паркаў XVIII—XIX стагоддзяў. Да нашых дзён захаваліся цэрквы і сядзібы, пабудаваныя ў мінулыя стагоддзі. Раю наведаць музей культуры і побыту імя Я. Драздовіча ў вёсцы Германовічы. Тут жа можна агледзець касцёл XVIII стагоддзя. Мясцовыя жыхары абавязкова раскажуць зацікаўленым гасцям легенду пра быццам бы пабудаваны калісьці падземны ход.

Ужо не ведаю, ці пашанцуе менавіта вам адшукаць гэты ход і ці будзе функцыянаваць глыбока пад зямлёй мабільная сувязь, але ў кампаніі МТС гарантуюць, што на зямлі, над вадой і нават у самых далёкіх лясных масівах без надзейнай мабільнай сувязі вы не застанеяцеся.

І за мяжу патэлефануеце лёгка. А што тут такога цяжкага? Дарэчы, Шаркоўшчыну добра ведаюць у Ізраіле. Адсюль жа родам быў чалавек, які літаральна вярнуў яўрэйскаму народу родную мову — іўрыт. Бен-Іегуда Перальман — асоба легендарная.

Заставайцеся на сувязі ў ліку абанентаў вядучага аператара мабільнай сувязі ў Беларусі. МТС не падвядзе і сумаваць не дасць. Да новых падарожжаў!

Аляксандр ПУКШАНСКІ. Шаркоўшчынскі раён.

Кватэрнае пытанне

Жыві ды не прыжывайся

Я з дарослым сынам жыву ў двухпакаёвай кватэры. Сюды ж ён хоча падсяліць свайго сябра, з якім некалі служыў у арміі. Кажа, што гэта часова, пакуль той не знойдзе сабе працу і іншае жыллё. Але я баюся, што потым усё ж могуць з'явіцца праблемы з яго высяленнем. Ці так гэта?

В. А., г. Мінск.

У адпаведнасці з артыкулам 40 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь наймальнік жылога памяшкання, член арганізацыі забудоўшчыкаў па ўзаемнай згодзе з поўнагадовымі членамі іх сем'яў, якія пражываюць з імі, а таксама ўласнік жылога памяшкання могуць дазволіць часовае пражыванне ў жылым памяшканні, якое знаходзіцца ў іх карыстанні або ўласнасці, іншым грамадзянам (часовым жыльцам) без спагнання платы за пражыванне.

Грамадзяне, якія атрымалі дазвол на часовае пражыванне ў жылым памяшканні, ніякіх праў на пастаяннае карыстанне гэтым жылым памяшканнем не набываюць. Часовыя жыльцы, незалежна ад працягласці іх пражывання ў памяшканні, абавязаныя неадкладна вызваліць жылое памяшканне па патрабаванні наймальніка жылога памяшкання і членаў сям'і, якія з ім пражываюць (уласніка жылога памяшкання; члена арганізацыі забудоўшчыкаў і членаў сям'і, якія ў ім пражываюць).

Ва ўсіх выпадках пры адмове вызваліць жылое памяшканне часовыя жыльцы падлягаюць высяленню ў судовым парадку без выдзялення іншага жылога памяшкання. Абавязковасць судовага разгляду ў такіх выпадках тлумачыцца неабходнасцю праверкі падстаў высялення асобаў, якія адмаўляюцца добраахвотна пакінуць жылое памяшканне, якое часова займаюць. На практыцы часам бывае, што часовыя жыльцы лічаць сябе членамі сям'і пастаяннага карыстальніка жылога памяшкання. Калі ў ходзе судовага разгляду высвятляецца, што яны такімі не з'яўляюцца, суд прымае рашэнне аб іх высяленні без выдзялення жылога памяшкання.

Да патрабаванняў аб высяленні часовых жыльцоў іскавая даўнасць не прымяняецца, паколькі яны, незалежна ад тэрміну пражывання, не набываюць права на жылую плошчу.

Віктар САВІЦКІ.

З нагоды юбілею жадаем Любові ГРАБЯНЕВІЧ з в. Літва здароўя, поспеху ў справах, рамантычных пачуццяў, шчырасці, радасці, шчасця.

Сябры са Стоўбцаў.

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА «ГІСТОРЫЯ-ТУР»
- Тур на фестываль «Гальшанскі замак», 21.08.2010 (папярэдні продаж квіткоў і арганізаваная дастаўка транспартам)
- Аўтобусныя экскурсіі па Беларусі
- Адпачынак у Еўропе і на моры
- Карпаратыўны адпачынак у шляхецкім фальварку Карчэўскіх, што ў Бянюнах
- Шэнгенскія візы
(029) 677 00 46 www.h-t.by

Галіну Міхайлаўну ТАРУШКУ віншуем з 55-годдзем! Жадаем здароўя, дабра, цяпла, аптымізму і поспеху.

Калегі, Новалукомль.

ДЗЕГЦЯРОВУ Веру Антонаўну, любую маму, бабулю, прабабулю, віншуем з 82-м годам нараджэння. Жадаем здароўя без лекаў, доўгага веку.

Твая сям'я.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.08	20.12	14.04
Віцебск —	5.55	20.05	14.10
Магілёў —	5.59	20.03	14.04
Гомель —	5.59	19.56	13.57
Гродна —	6.24	20.27	14.03
Брэст —	6.28	20.24	13.56

Месяц

Поўня 24 жніўня.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Евы, Аляксея, Аркадзя, Васіля, Маркела, Мікалая, Уладзіміра, Фёдара.*

К. *Монікі, Тодара, Цэзара, Юзафа.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

27 жніўня

1860 год — нарадзіўся (в. Станькава, зараз Дзяржынскі раён) Карл Эмерыкавіч Чапскі, адзін з прадстаўнікоў вядомага старажытнага роду Гутэн-Чапскіх. У 1882 годзе скончыў Дэрпцкі (Тартускі) універсітэт. У 1890-1901 гадах — гарадскі галава ў Мінску. Узначальваў розныя грамадскія і дзяржаўныя арганізацыі. Адкрыў у Мінску прытулак для бяздомных, шпіталь, амбулаторыю, запусціў электрастанцыю, трамвай, забрукаваў вуліцы. Садзейнічаў адкрыццю ў горадзе Таварыства аматараў спорту (з 1892 года з'яўляўся яго старшынёй), Таварыства абароны жанчын, гарадскога крэдытнага таварыства. Быў актыўным членам Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Пабудаваў піўзавод «Багемія», які пасля быў прададзены сямейству Лекертаў. Памёр у 1904 годзе.

1910 год — 100 гадоў з дня нараджэння Агнес Гонджа Баяджыу, больш вядомай пад манаскім імем Маці Тэрэза, місіянеркі Рымска-каталіцкай царквы. Адна з заснавальніц і ігумення Ордэна міласэрнасці (1950), лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру (1979), вядомая сваім падзвіжніцтвам у справах дабрачыннасці. Кананізавана ў 2002 годзе.

Цытата дня:

«Прыгожыя птушкі пяюць горш за іншых. Тое ж адносіцца і да людзей. У вычурным стылі не трэба шукаць глыбокай думкі».

Георг Крыстаф Ліхтэнберг (1742—1799), нямецкі пісьменнік і літаратурны крытык.

ПЕРШАЕ ВІНШАВАННЕ — АД МУЖЧЫНЫ

Падчас шлюбнага абраду ў храме жаніх і нявеста атрымлівалі сімвалічнае рытуальнае абнаўленне, таму асаблівую ролю адводзілі сімволіцы першага:

- вянчанне ў першы дзень тыдня — у нядзелю;
- новае, а значыць, у першы раз апранутае адзенне; менавіта ў першы раз нявеста цалкам апраналася ў святочны строй толькі тады, калі адпраўлялася пад вянец: да гэтага яна не павінна была прымяраць увесь строй цалкам (параўнаеце: каб на працягу года жыць у дастатку, на Каляды трэба было абавязкова апранаць новае адзенне);
- першае віншаванне (лічылася, што першым павенчаных маладых павінен павіншаваць мужчына, гэта прынясе ім шчасце;
- першы стрэчны каля царквы: багаты, шчаслівы чалавек — да багацця, жабрак — да недахопаў.

ВЯНЧАЛЬНЫЯ РЭЧЫ

- Тое адзенне, у якім бралі шлюб маладыя, нельга было аддаваць камусьці іншаму або выкідаць. Яго таксама нельга было выкарыстоўваць у штодзённым жыцці.
- Асабліва сакральнае стаўленне было да вэлюма нявесты.
- Вянчальныя свечкі захоўвалі ўсё жыццё за абразамі ў чырвоным куце. Лічылася, пакуль яны там, шчасце не пакіне хату. Неабходна ведаць, што запальваць іх можна было альбо пры цяжкіх родах, альбо ў выпадку хваробы дзяцей.
- Лічылася, што калі ў адзін дзень бяруць шлюб адразу некалькі пар, то бяда напраткае трэцюю пару.
- Вянчаюцца толькі тыя маладыя, якія стаяць на галоўнай восевай лініі храма, непасрэдна перад алтаром.
- Дрэннай прыкметай лічылі вянчанне ў адзін год двух сясцёр або двух братоў або адначасовы шлюб двайнят.
- Калі ў маладых доўгі час не нараджаліся дзеці, ім раілі «развянчацца» і зноў «павянчацца» ў гэтай жа царкве.

«НЕЦАРКОЎНАЕ ВЯНЧАННЕ»

З-за аддаленасці царквы або адсутнасці святароў у славян некаторы час існавала так званае «нецаркоўнае вянчанне». Гэты абрад маглі праводзіць дома, функцыі святара пры гэтым перадавалі хросным бацькам. У некаторых рэгіёнах маладых вялі да самага святога месца ў акрузе, напрыклад да каменя-валуна, старажытнага дрэва, крыніцы і г. д. Часам дуб выступаў аналагам храма. На Віцебшчыне і Магілёўшчыне лічылася, што маладыя павенчаныя, калі яны тройчы абыдуць вакол дуба. У вясельных песнях так і спявалася:

Абвёў вакол дуба,
Ды й няхай будзе люба.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

На прыёме ў кардыёлага.

— Сідараў, колькі піва вы выпіваеце ў дзень?

— Чатыры бутэлькі.

— Як чатыры?! Я ж вам толькі дзве дазволіў!

— Яшчэ дзве мне дазволіў тэрапеўт.

☺

Мужык прачынаецца ў першы дзень адпачынку. Паперка каля ложка: «Дарагі, катлеты на стале, астатняе ў халадзільніку».

— Пачнём з халадзільніка, — вырашыў мужык, пачаўшы рукі.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4182 Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12